ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 63 (2423)
12 жніўня 1969 г. АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

На пасяджэнні сакратарыята праўлення Саюза архітэктараў Беларусі абмеркаваны ход падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Намеснік старшыні праўлення Саюза архітэктараў Беларусі заслужаны архітэктар БССР М. Ліўшыц расказаў нашаму карэспандэнту:

— Рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, праўленне Саюза архітэктараў Беларусі звярнулася з пісьмом да мясцовых аддзяленняў Саюза з заклікам дастойна сустрэць слаўную гадавіну, разам з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі разгарнуць прапаганду дасягненняў савецкай архітэктуры і будаўніцтва, ленінскіх ідэй у галіне архітэктуры, манументальнай прапаганды.

Усім аддзяленням разасланы прыкладны план лекцый і гутарак, прысвечаных знамянальнай гадавіне, рэкамендавана арганізаваць выстаўкі, вечары, экскурсіі па ленінскіх мясцінах, прагляды кінафільмаў і дыяпазітываў ленінскай тэматыкі.

Падрыхтоўка да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна і шырокая прапаганда дасягненняў савецкай архітэктуры — галоўнае ў рабоце бюро прапаганды, якое ствараецца пры Саюзе архітэктараў БССР. Задачы бюро прапаганды, якое будзе працаваць у цесным кантакце з рэспубліканскім таварыствам «Веды», — каардынацыя дзейнасці лектарскіх груп пры праектных інстытутах, распрацоўка тэматыкі і абмеркаванне лекцый па архітэктуры, наладжванне сувязей з прадпрыемствамі, калгасамі, навучальнымі ўстановамі і воінскімі часцямі, арганізацыя лекцый і выставак. Бюро будзе заключаць дагаворы на чытанне цыклаў лекцый і асобныя выступленні архітэктараў, праводзіць «архітэктурныя прэм'еры» — сустрэчы аўтараў новых пабудаваных аб'ектаў з калектывамі працоўных. Яно арганізуе выпуск друкаваных выданняў, прысвечаных помнікам архітэктуры, сувеніраў, прыме актыўны ўдзел у прапагандзе архітэктуры ў друку, па радыё і тэлебачанні.

100 ДОЙЛІДЫ РАЯЦЦА, ШУКАЮЦЬ, ПЛАНУЮЦЬ

Нядаўна адбылося пасяджэнне секцыі інфармацыі і прапаганды Саюза архітэктараў БССР (старшыня—заслужаны архітэктар БССР А. Ладыгіна), прысвечанае падрыхтоўцы да ленінскай гадавіны.

Цяпер на прадпрыемствах, у навучальных установах і воінскіх часцях чытаюцца лекцыі «Заснавальнікі марксізма-ленінізма аб архітэктуры і горадабудаўніцтве», «Ідэі У. І. Леніна ў галіне манументальнай прапаганды», «У. І. Ленін і праблемы савецкага горадабудаўніцтва», «У. І. Ленін і ахова прыроды ў сацыялістычнай дзяржаве», «Архітэктура і горадабудаўніцтва ў кнігах асабістай бібліятэкі У. І. Леніна», «Паплечнік У. І. Леніна—Н. К. Крупская аб горадабудаўніцтве», «Архітэктура Беларусі за 50 гадоў Савецкай улады», «Будучыня беларускіх гарадоў» і інш.

Актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе прымаюць А. Воінаў, В. Анікін, Н. Трахтэнберг, І. Іода, І. Елісееў, А. Сычова, Г. Горына, Я. Сап'янік, Г. Фадзеева, Л. Кантаровіч і іншыя архітэктары.

Секцыяй грамадскіх будынкаў Саюза архітэктараў БССР (кіраўнікі Ю. Грыгор'еў і С. Філімонаў) абмеркавана экспазіцыя Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі БССР, прысвечанай поспехам рэспублікі за 50 гадоў Савецкай улады. Работа архітэктараў і мастакоў, якія рыхтавалі экспазіцыю выстаўкі, прадстаўлена, як вядома, на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР за 1969 год.

Секцыя горадабудаўніцтва (кіраўнікі А. Лысенка і Г. Парсаданаў) прыняла актыўны ўдзел у абмеркаванні конкурсных матэрыялаў праекта забудовы цэнтра Мінска. Цяпер распрацоўваюцца ўмовы конкурсу на праект забудовы і рэканструкцыі плошчаў імя У. І. Леніна і Цэнтральнай у Мінску.

Актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы навукова-тэхнічных канферэнцый, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, і члены секцыі навукі і архітэктурнай адукацыі (кіраўнікі А. Воінаў і Л. Міронава). Да знамянальнай даты вырашана звыш намечанага раней плана падрыхтаваць рукапісы дзвюх кніг па надзённых пытаннях горадабудаўніцтва, выпусціць навуковы зборнік, падрыхтаваць серыю артыкулаў для часопісаў аб дасягненнях беларускай савецкай архітэктуры.

Члены секцыі вонкавага афармлення гарадоў (кіраўнік А. Наканечны) удзельнічаюць у падрыхтоўцы эскізных праектаў афармлення гарадоў рэспублікі да святкавання стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Найбольш цікавыя праекты будуць абмеркаваны ў Саюзе архітэктараў БССР.

У плане мінскага Дома архітэктара — сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, мастакамі, артыстамі, якія працуюць над увасабленнем ленінскай тэмы, сустрэчы з удзельнікамі будаўніцтва Дома ўрада і помніка У. І. Леніну ў Мінску. У бібліятэцы Дома архітэктара наладжваецца выстаўка «Ленін аб мастацтве, архітэктуры, манументальнай прапагандзе». Рыхтуецца перасоўная фотавыстаўка «Архітэктары і мастакі Беларусі — Леніну».

У радзе гарадоў рэспублікі ў гонар слаўнай гадавіны адкрываюцца помнікі правадыру. У іх збудаванні, перапланіроўцы плошчаў і вуліц, што прымыкаюць да манументаў, дзейсны ўдзел прымаюць аўтарскія групы архітэктараў.

Так што, як бачыце, дойліды Беларусі сустрэнуць слаўны юбілей сапраўды творча.



Гэта палатно Міхаіла Савіцкага «Рабочыя», якое разам з яго карцінамі «Пакаранне смерцю» і «Хлябы» прадстаўлена прэзідыумам праўлення Саюза мастакоў БССР на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1969 года.

Матэрыялы аб творах, вылучаных на атрыманне прэміі, чытайце на 2-й старонцы.

ЛЕНІНСКАЙ ТЭМЕ—ЯШЧЭ БОЛЬШУЮ ЎВАГУ

8-га жніўня адбылося чарговае пасяджэнне прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР.

«Планаванне і адлюстраванне ленінскай тэматыкі ў часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Неман» і газеце «Літаратура і мастацтва» — гэта пытанне разглядалася на пасяджэнні.

Намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» — Аляксей Русецкі, адказны сакратар часопіса «Беларусь» — Міхась Досін, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» — Алесь Асіпенка, галоўны рэдактар часопіса «Неман» — Андрэй Макаёнак і намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» — Алесь Бажко ў сваіх выступленнях расказалі пра тое, што ўжо зроблена па адлюстраванні ленінскай тэматыкі ў перыядычных выданнях, падзяліліся планамі і задумамі рэдакцый на далейшы час.

У спрэчках прынялі ўдзел Максім Танк, Іван Шамякін, Іван Мележ, Пімен Панчанка, Пятро Глебка, Кастусь Кірэенка, Алесь Бачыла і Еўдакія Лось.

На пасяджэнні прэзідыума вырашана таксама склікаць чарговы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР у сярэдзіне лістапада бягучага года на тэму: «Беларуская літаратура — да стагоддзя У. І. Леніна».

НА МАСКОЎСКАЙ СЦЭНЕ

У мінулым месяцы масквічы горача апладзіравалі самадзейным спевакам і танцорам народнага калектыву Палаца культуры Мінскага аўтазавода. І вось новая сустрэча. На гэты раз гасцямі сталіцы стаў Казловіцкі народны ансамбль Слуцкага раёна. Больш ста спевакоў і танцораў гэтага заслужанага калектыву выступяць з вялікай канцэртнай праграмай на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, у клубах і палацах культуры прамысловых прадпрыемстваў, у калгасах і саўгасах Падмаскоўя.

Праграма адкрываецца песняй нашага земляка самадзейнага кампазітара П. Шыдлоўскага «Прывітальная Маскве» і песняй кампазітара А. Копасава—«Думы аб Леніне». Масквічы пачуюць таксама шмат беларускіх народных песень. Сярод іх—«Кацярына», «Сонца», «Ой, у лузе, лузе» і іншыя.

Танцавальная група ансамбля пакажа свае новыя работы — танец «Беларускія вышывальшчыцы» і вакальна-харэаграфічную кампазіцыю, прысвечаную тэме герагічнай барацьбы беларускага народа ў гады мінулай вайны.

ПРЫЗЫ ЧАКАЮЦЬ ЛЕПШЫХ

У Чэлябінску адбываецца Усесаюзны маладзёжны фестываль савецкай песні, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Ад нашай рэспублікі ў ім прымае ўдзел лаўрэат Беларускага фестывалю маладых выканаўцаў, саліст радыё і тэлебачання Аляксандр Гракаў.

Беларускі кампазітар Ігар Лучанок уваходзіць у склад журы.

У час фестывалю выканаўцаў будзе таксама праведзены конкурс на лепшую сучасную песню. Сярод іншых на гэта спаборніцтва прадстаўлена і новая песня І. Лучанка «Чырвоныя зоркі».

Заключны канцэрт фестывалю адбудзецца ў другой палове жніўня.

ВІНШУЕМ З ГАНАРОВЫМ ЗВАННЕМ

За шматгадовую актыўную працу ў развіцці беларускай савецкай архітэктуры, кіраўніку архітэктурна-канструктарскай майстэрні праектнага інстытута «Мінскпраект» тав. Баткоўскаму Сяргею Барысавічу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоена ганаровае званне заслужанага архітэктара Беларускай ССР.

ДРУГОЕ ПРЫЗВАННЕ



27 жніўня 1919 года У. І. Ленін падпісаў Дэкрэт Савета Народных Камісараў аб пераходзе фатаграфічнай і кінематаграфічнай прамысловасці і гандлю ў рукі дзяржавы. За гэтыя гады кінематаграфісты краіны далі народу больш чатырох тысяч фільмаў розных жанраў—мастацкіх, дакументальных, навукова-папулярных, вучэбных, мультыплікацыйных... Пашыраецца сетка кінатэатраў у гарадах і вёсках. Колькасць жа гледачоў дасягае амаль пяці мільярдаў (у 1968 годзе), г. зн. трынаццаці мільёнаў штодня. Стужкі з маркамі студый Краіны Саветаў дэманструюцца цяпер у ста чатырох дзяржавах свету.

Ёсць ва ўсім гэтым і значны ўклад беларускай кінематаграфіі, на творчым рахунку якой сто дваццаць шэсць толькі мастацкіх стужак. З творчымі справаздачамі перад працоўнымі рэспублікі ў гэтыя дні выступаюць многія стваральнікі гэтых карцін — рэжысёры, аператары, артысты. На экранах дэманструюцца лепшыя фільмы мінулых гадоў і адбываюцца прэм'еры новых твораў.

Сёння газета «Літаратура і мастацтва» пачынае друкаваць матэрыялы, прысвечаныя 50-годдзю нашага кінематографа, якія пазнаёмяць чытачоў з цікавымі фактамі з гісторыі станаўлення мастацтва кіно ў рэспубліцы, з творчасцю выдатных беларускіх акцёраў, з лепшымі стужкамі і іх творцамі.

Кінематограф захаваў для нас жывы твар Г. Глебава—і ў жыцці, калі яго здымалі дакументалісты, і ў вобразах, створаных артыстам. Гледачы могуць і цяпер на экране пабачыць яго ў творчасці, у моманты высокага артыстычнага натхнення. А якім яго ведаюць тыя, хто здымае фільмы, — пра гэта расказваюць дзеячы беларускага кіно.

У. КОРШ-САБЛІН, народны артыст БССР, кінарэжысёр:

— Я часта думаю, у чым сакрэт папулярнасці Глебава, чым скараў ён гледача. Адны лічылі, што галоўнае тут звычайная незвычайнасць: талент; іншыя—рэдкая глебаўская абаяльнасць, пераканаўчасць, калі вы забываліся, што перад вамі акцёр. Усё гэта правільна. Але рэдка хто задумваецца, адкуль гэта ўсё ў Глебава і чаго гэта яму каштавала.

Мне давялося працаваць з Глебам Паўлавічам у фільме «Канстанцін Заслонаў», дзе ён выконваў ролю Кроплі, потым у экранізацыі п'есы «Хто смяецца апошнім», у «Першых выпрабаваннях» па трылогіі Я. Коласа і ў іншых кінакарцінах. Усе яго ролі як быццам нічога агульнага не мелі паміж сабой. Разам з тым іх аб'ядноўвала глыбока індывідуальная глебаўская манера ігры. Глеб Паўлавіч заўсёды прыходзіў на здымачную пляцоўку з цікавымі, часам нечаканымі прапановамі, якія ўзбагачалі не толькі яго ролю, але і сцэну, у якой ён і не быў заняты. З ім было прыемна і лёгка працаваць, калі творчая работа наогул можа быць лёгкай... У апошнія гады, хворы, ён не пераставаў працаваць—у гэтым было ўсё яго жыццё, і інакш ён не мог. Відаць, таму Глебаў і дасягнуў тых вяршынь акцёрскага майстэрства, якія зрабілі яго адным з самых любімых і папулярных акцёраў не толькі ў рэспубліцы, а і ва ўсёй краіне.

С. СПЛАШНОЎ, кінарэжысёр:

— Гэта было ў 1947 годзе. Я разам з А. Шульманам здымаў Глеба Паўлавіча ў сцэнах з «Паўлінкі», якія павінны былі ўвайсці ў фільм-канцэрт «Родныя напевы». Так здарылася, што потым гэтыя тры часткі ў фільм не ўвайшлі. І невядома зараз, дзе яны. Вось бы іх адшукаць!

Другі раз Глеб Паўлавіч прадстаў перад здымачнай камерай праз год, калі для кінастужкі «30 гадоў БССР» спатрэбілася сцэна са спектакля «Хто смяецца апошнім». Мне здаецца, што найбольш вядомая роля Глебава ў кіно—вобраз Шпакоўскага ў кінакамедыі «Нашы суседзі». Усе памятаюць лепшыя сцэны—глебаўскі «танец з шаблямі» ў рэстаране, а потым вяртанне дамоў—найцяжэйшую яго размову з лютай жонкай... Мы разам з ім шукалі камедыйныя дэталі, але большасць яркіх знаходак належыць цалкам Глебаву—ён быў надзвычай шчодры на гэта. Эх, як мала мы здымалі Глеба Паўлавіча...

Я. ГАНКІН, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кінамастак:

— Упершыню я з Глебавым пазнаёміўся ў сорак сёмым, калі па маіх эскізах будавалася хата Крыніцкага для сцэн з «Паўлінкі». Дэкарацыя яшчэ толькі ўстанаўліваліся, а Глебаў заходзіць у выгарадкі, пачынае пытаць: «А што на гэтай сцяне вісець будзе? Уваход дзе? Гэта што?» Ён адчуваў сябе ў павільёне, як дома. Хадзіў па кутках «кватэры», абжываючы яе, прымаў розныя позы, нешта адмерваў, мармытаў... Я ўпотай назіраў за дзівацтвамі Глеба Паўлавіча, а неўзабаве, убачыўшы ўсё гэта на экране, зразумеў, што прысутнічаў пры нараджэнні цудоўных знаходак.

Неяк на здымках у Астрашыцкім Гарадку адной са сцэн фільма «Хто смяецца апошнім» я аказаўся выпадковым сведкам таго, як Глебаў шукаў паходку для Тулягі. І хоць гэтую ролю ён гадамі іграў на сцэне, але калі п'есу пачалі экранізаваць, а некаторыя сцэны здымаць на натуры, Глеб Паўлавіч адчуў, што яго не ўсё задавальняе, што трэба шукаць новыя фарбы, дэталі для кіно.

Ён звычайна вельмі ўважліва выслухоўваў рэжысёра, рэдка спрачаўся. Калі ж на здымачнай пляцоўцы давалася каманда: «Матор!», іграў на поўную сілу, жыў пачуццямі свайго героя, быў ім. Ён пераконваў рэжысёраў не тэатральнымі развязаннямі, а жыццёвымі паводзінамі перад апаратам. Колькі б дубляў ні здымалася—ніводнага ў яго не было аднолькавага. Гэта была заўсёдная імправізацыя. І лёгка рэжысёру было з ім, і цяжка—паспрабуй выбяры з дзесяці бліскучых глебаўскіх дубляў адзіны...

А. БУЛІНСКІ, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, аператар:

— Я вельмі рэдка смяюся каля апарата, хоць зняў ужо не адну камедыю. Але калі ішла сцэна ў рэстаране, ці ў ванне з «Нашых суседзяў», я знемагаў ад смеху, назіраючы за Глебавым, любаваўся ім, забываючыся нярэдка, што трэба здымаць... Ён глыбока разумеў спецыфіку кіно, у тым ліку і нашу аператарскую прафесію. Яму было ўласціва прыроднае адчуванне граніцы кадра. Добра разумеў ён, што такое буйны план — і тут іншымі ў яго былі і жэст і позірк. Глебаў добра адчуваў рытм той ці іншай сцэны.

К. БАК, гукааператар студыі «Беларусьфільм»:

—Гукавое вырашэнне вобраза, якое прыносіў на здымкі Глебаў, не патрабавала, як правіла, пераагучвання. А калі ўсё ж часам прыходзілася гэта рабіць не па віне акцёра — для Глеба Паўлавіча такія здарэнні былі пакутамі... Бо агучваючы сцэну, акцёру нельга адыходзіць амаль ні на крок ад мікрафона. І ўсё ж Глебаў рабіў спробы хадзіць, нешта рабіць—не мог ён прымусіць сябе, не іграючы, ствараць гукавы вобраз.

Глеб Паўлавіч па голасе пазнаецца заўсёды — паслухайце, скажам, па радыё запісы яго голасу!—але якія розныя фарбы, адценні ў гукавым вырашэнні ўсіх 19 яго кінароляў. Якая ў гэтага акцёра багатая моўная гама! Які невычэрпны дыяпазон гучання!

Не ўмеў ён берагчы сябе. Нават на чарговай рэпетыцыі Глебаў іграў так, як на здымцы. Здымаем першы дубль, пяты, шосты—і ўсюды ён, як кажуць, выкладваўся. «Паберажыце сябе, Глеб Паўлавіч, тут можна сыграць не на поўную сілу»,—падказвалі яму, але гэтага ён нібы і не чуў... Уражвала кінематаграфістаў яго сабранасць, заўсёдная гатоўнасць здымацца, уменне непазнавальна ўнутрана пераўвасабляцца і рабіць гэта імгненна. У драматычнага акцёра гэтыя якасці не часта сустракаюцца. Вось чаму можна смела сцвярджаць, што кінематограф быў другім прызваннем гэтага вялікага артыста.

В. СУКМАНАЎ, кінарэжысёр аб'яднання «Летапіс»:

— Летам 1965 года мы здымалі кінанарыс пра Глебава — «Дыялог з акцёрам». Ва ўсёй здымачнай групы было адзінае адчуванне, што мы займаемся забароненай справай. Глеб Паўлавіч быў тады вельмі хворы. А перад здымачнай камерай ён нібы пераўвасабляўся, інтуітыўна здагадваючыся, калі мы пачыналі ўпотай здымаць яго. І здзіўляў непасрэднасцю, якая бывае ўласціва вельмі добрым людзям...

Р. МАСАЛЬСКІ, кінааператар:

— Неяк мы прыехалі да Глебава на дачу, а ён ходзіць у лясочку з унучкай і ягады збірае. Устанавіў я ціхенька кінакамеру, а хтосьці са здымачнай групы фільма «Дыялог з акцёрам» як выгукне: «Таварыш Туляга! Вас выклікае Гарлахвацкі». І я раптам убачыў, як змяніўся, збялеў твар Глебава, як задрыжалі яго рукі, закалаціўся ён увесь, стаў ніжэйшым—некуды знік Глеб Паўлавіч, перад намі на палянцы стаяў Туляга. Такое мастацтва—літаральна на вачах людзей пераўвасабляцца ў вобраз—дзівоснае.

І яшчэ незабыўнае. Кожны раз на Першае мая ці ў свята Кастрычніка да нашай апаратарскай групы з гасцявой трыбуны абавязкова падыходзіў Глебаў, з усімі цёпла вітаўся, доўга гутарыў, жартаваў. Усіх нас ён ведаў, і ўсе яго добра ведалі і бязмерна паважалі. І зараз, у кожнае свята, калі я стаю з кінакамерай на Цэнтральнай плошчы, раз-пораз азіраюся на гасцявыя трыбуны: такое адчуванне, што зараз да мяне і маіх калег, як заўсёды, падыдзе такі знаёмы і блізкі Глеб Паўлавіч...

■

Такое ўражанне, што Глебаў з намі, узнікае ў многіх. Паслухаеш радыёперадачу з яго ўдзелам, запісаную раней на магнітафонную стужку, паглядзіш фільм, дзе ён у камедыйнай ролі, — здаецца, нібы гэта створана акцёрам учора, нават сёння. Калі я гутарыў з жонкай Глеба Паўлавіча, Надзея Аляксандраўна раптам прызналася, што яна не можа звыкнуцца з думкай, што яго няма: «Здаецца, быццам Глебушка паехаў некуды на здымкі фільма...»

Здымаючыся ў кіно, Глебаў аб'ездзіў усю Беларусь, Украіну, Падмаскоўе, працаваў у павільёнах Масквы, Адэсы, Кіева... У запісной кніжцы Глеба Паўлавіча я нечакана знайшоў такія кароценькія запісы: «Выехаў у Оршу. Прымерваў касцюм Кроплі... Заўтра пачынаем працаваць на натуры... Абжываюся ў хаце Кроплі — у касцюме, але без грыму...»

Здымацца ён любіў. Яму падабалася ездзіць па краіне, бачыць новыя мясціны, кожны дзень сустракацца з новымі людзьмі. Здымкі ў карціне «Людзі на мосце» («Масфільм», 1959 год, рэжысёр А. Зархі), дзе ён сыграў старога рабочага-камуніста Паромава, далі яму магчымасць пабываць на Брацкай ГЭС. На натуру для фільма «Як пасварыліся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам» па аповесці Гогаля (Адэская студыя) Глебаў ляцеў спачатку на верталёце, а потым воінская часць дала здымачнай групе танкетку—ніякім іншым транспартам у маленькі гарадок было не дабрацца.

У снежні 1964 года Глебава палажылі ў Крамлёўскую бальніцу — на аперацыю. А перад гэтым ён зняўся ў ролі Фрола Баева ў двухсерыйным фільме Адэскай студыі «Адзінота» па вядомым рамане М. Вірты. Трэба было агучыць некаторыя сцэны. Дырэктар кінакарціны нейкім цудам прабраўся ў Крамлёўскую бальніцу з гуказапісваючай апаратурай (відаць, не без дапамогі Г. Глебава)—работа над фільмам была тут і завершана...







Кадры з фільмаў, у якіх здымаўся Г. П. Глебаў.
«Хто смяецца апошнім».
«Нашы суседзі».
«Запомнім гэты дзень».

На экранах кінатэатраў і тэлевізараў часта дэманструюцца фільмы з яго ўдзелам. Па радыё амаль кожны тыдзень чуюцца апавяданні і казкі, якія «нагаварыў» на доўгія гады непаўторным, цудоўным голасам Глеб Паўлавіч. Яшчэ невядома, хто больш—мы, ці нашы дзеці—верыць у тое, што добры, мудры казачнік, чараўнік сцэны і кінематографа жыве сярод нас.

І. РЭЗНІК.

ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ...

Неўзабаве ў вестыбюлях інстытутаў вывесяць доўгія спісы з прозвішчамі шчасліўцаў, тых, хто з гэтага дня можа называць сябе студэнтам.

А пакуль што ідуць экзамены... Вось пяць фотаздымкаў, якія зрабілі нашы фотакарэспандэнты ў Беларускім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Калі глядзіш на іх—разумееш, якая гэта напружаная барацьба, барацьба за права звацца студэнтам.

Фота Ул. КРУКА. і А. КАЛЯДЫ.

Да экзамена 14 хвілін...

Моцны арэшак.

Добраму адказу і экзаменатар рады...

Так спасцігаецца сман студэнцкага жыцця...

Пачынаць са спазнення— дрэнная прыкмета...

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР

АБМЯРКОЎВАЕМ ВЫЛУЧАНЫЯ ТВОРЫ

25 ліпеня гэтага года ў газеце «Літаратура і мастацтва» надрукаваны спіс кандыдатур, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР 1969 г. у галіне літаратуры, журналістыкі, выяўленчага мастацтва, музыкі, тэатральнага мастацтва, кінематаграфіі, радыё і тэлебачання, архітэктуры. У сённяшнім нумары мы пачынаем абмеркаванне вылучаных твораў. Да ўдзелу ў абмеркаванні запрашаюцца ўсе чытачы газеты.

АРЫГІНАЛ ЦІ КОПІЯ?

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ адкрыцці, зробленыя ў апошні час у генетыцы, даюць падставы меркаваць, што не ў такім ужо далёкім будучым чалавецтва зможа «ствараць» людзей, якія будуць дакладнай копіяй вучонага, кампазітара ці пісьменніка. Іх называюць «малодшымі блізнятамі-братамі». Пра гэта нядаўна пісала «Литературная газета». «Паўтарыць чалавека? Спрэчная мэта», — адгукнуўся на артыкул [illegible] філосаф.

Сапраўды, кожны чалавек каштоўны непаўторнасцю духоўнага свету, своеасаблівасцю сваёй індывідуальнасці. У мастацтве гэты закон праяўляецца асабліва яскрава. Адзін талент заўсёды непадобны на другі. У яго свае бачанне жыцця, свае вобразнае светаўспрыманне. Гэта — першаадкрывальнік, землепраходзец, аўтар твораў арыгінальных, наватарскіх па думцы і выкананні: «Балада пра салдата» і «Лятуць журавы»..., «Звычайны фашызм» і «Лёс чалавека»..., «Іванава дзяцінства» і «Бацька салдата»... Усе яны — пра вайну. Адна тэма, але кожны раз па-новаму прапушчаная праз сэрца аўтара. Кожны раз — новае творчае [illegible], полымя сэрца, перададзенае людзям.

У фільме «Дажывём да панядзелка» ёсць цікавая і вельмі важная думка, выказаная галоўным героем, настаўнікам: «Каб аддаваць, трэба мець, што аддаваць». Гэта асабліва датычыцца людзей мастацтва. Праўда, калі не хапае свайго, пазычаюць у суседа. Тады атрымліваюцца фільмы-блізняты. Ці трэба адмаўляць іх права на жыццё? Відома, не. Будзем шчырымі. Мастацтва не можа рухацца наперад адным шэдэўрам. У год выходзіць на экран каля 120 новых айчынных фільмаў, сярод іх і выдатныя, і добрыя, і сярэднія, і дрэнныя.

І калі фільм зроблены прафесійна пісьменна, калі ён нясе гледачу добрыя пачуцці і выклікае поўны эмацыянальны зарад у глядзельнай зале — ён, безумоўна, патрэбны. Такі, на маю думку, фільм «Іван Макаравіч», пастаўлены на студыі «Беларусьфільм». У ім расказваецца гісторыя хлопчыка, што ў часы вайны згубіў бацькоў і вымушаны быў рана стаць дарослым, узяць на сябе клопат аб чужой сям'і. Карціна спрыяльна была прынята дарослымі і маленькімі гледачамі.

Але ж цяпер фільм «Іван Макаравіч» вылучаны на Дзяржаўную прэмію БССР, і гэта, на маю думку, дае падставы для спрэчак. Давайце калектыўна падумаем — ці ёсць у дадзеным выпадку твор, варты такой высокай узнагароды? Якімі крытэрыямі трэба кіравацца?

У палажэнні аб узнагародах гаворыцца: «Дзяржаўныя прэміі БССР прысуджаюцца за выдатныя творы.., якія садзейнічаюць камуністычнаму выхаванню працоўных, адпавядаюць прынцыпу сацыялістычнага рэалізму і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне». За выдатныя! Значыць, ацэньваць твор трэба па самых высокіх крытэрыях. Часам у прэсе можна сустрэць паблажлівыя скідкі на маладосць рэжысёра І. Дабралюбава, для якога «Іван Макаравіч» — другая самастойная работа ў кіно. Рэжысёр Ігар Дабралюбаў цяпер у тым творчым узросце, калі мастак павінен працаваць самастойна, вызваляцца ад непазбежнага ў пачатку шляху вучнёўства.

З другога боку, маладосць, як рыса таленту — гэта пошук. Могуць быць і памылкі, і няўдачы, але гэта зразумела. Першы фільм І. Дабралюбава «Іду шукаць» аднадушна быў прызнаны няўдалым, пераймальным, па-вучнёўску бляклай копіяй фільма М. Рома «Дзевяць дзён аднаго года». Ці ж не горка было чытаць І. Дабралюбаву ў артыкуле Г. Жжонава, акцёра сур'ёзнага і патрабавальнага, такую, напрыклад, ацэнку рэжысуры: «Фільм ствараўся вельмі цяжка, у жорсткіх спрэчках з рэжысёрам, які хацеў быць сціплым і баяўся свайго ценю». («Искусство кино», № 6, 1969)? Мабыць, ужо гэта магло б насцярожыць мастака, падказаць яму далейшы шлях у кіно.

Але... Боязь свайго ценю адчуваецца ў поўнай ступені і ў «Іване Макаравічу». Баяцца ж ценю — азначае не трапіць у свет адкрыццяў, «хадзіць», як кажуць, у ураўняльных, эпігонах.

У прэсе былі водгукі на фільм, якія падкрэслівалі менавіта гэтую якасць стужкі — адсутнасць творчай смеласці, запазычанасць кінематаграфічнага вырашэння. Прыгадаю некаторыя з іх:

«Відаць, ужо ў самім сцэнарыі адсутнічала глыбіня, так неабходная для паказу і раскрыцця характару. А рэжысёр пры пераносе літаратурнай асновы на экран не ўзяў на сябе смеласці больш шырока, глыбока і ў той жа час больш канкрэтна праналізаваць сітуацыі» («Чырвоная змена»).

«Ужо ў сцэнарыі «Івана Макаравіча» былі закладзены істотныя недахопы будучага фільма... Часта на экране мы бачым, што сцэнарыст адкрыта ілюструе свае думкі, падганяе жыццёвыя сітуацыі пад загадзя вызначаныя схемы» («Літаратура і мастацтва»).

«Я не магу сказаць, што «Іван Макаравіч» — вялікая творчая ўдача рэжысёра, што кінастудыя, нарэшце, парадавала нас творам, які б адпавядаў высокім патрабаванням часу», — пісаў рэцэнзент у «Вячэрнім Мінску».

Дык як жа быць з тым пунктам палажэння, які прадугледжвае творы, што «атрымалі шырокае грамадскае прызнанне»?

Праўда, у «Івана Макаравіча» ёсць і свае прыхільнікі. У некаторых гледачоў фільм выклікае ўспаміны аб перажытым, асацыятыўныя эмоцыі, а малодшае пакаленне наведвальнікаў кінатэатраў ён вучыць дабру. Сапраўды, аўтары ўзялі сітуацыю, якая хвалюе кожнага — лёс самотнага хлопчыка без бацькоў... Нават па-рамесніцку зробленая карціна з такім героем можа расчуліць гледачоў.

У творы ж мастацтва галоўнае — не проста сітуацыя, а той характар героя, які праяўляецца ў ёй. **Які** гэта хлопчык, **як** фарміруецца ў ім характар мужны і горды, **як** становіцца ён з Вані, Ванюшы — Іванам Макаравічам? Задача была цікавая. Ці вырашана яна? На маю думку — не. Прынамсі, не арыгінальна, калі і вырашана...

Уся першая палова фільма (дарэчы, аператарскі знятая добра, з настроем) — як назыўныя сказы, як расказ не толькі пра тое, што шмат разоў было ў кіно, але было **гэтак жа** неаднойчы. Сцэны мірнага жыцця — парафраза «Іванава дзяцінства», сцэны эвакуацыі — нагадваюць «Лёс чалавека», хлопчык у цягніку — успамінаецца «Уступ»...

Успамінаюцца і «Я родам з дзяцінства», і «Міма вокнаў ідуць цягнікі». Знаёмыя матывы і сітуацыі, знаёмае экраннае ўвасабленне, і калі нас нешта хвалюе ў фільме, — ці не прымаем мы эмацыянальны штуршок памяці, удар па нервовых струнах, ажыўленне жыццёвых асацыяцый, звязаных з вайной, за сапраўднае эмацыянальнае ўспрыняцце самога фільма?

Самае галоўнае і цікавае магло б пачацца ў другой частцы карціны, калі ўмовы, у якія пастаўлены Ваня, прымушаюць яго раскрыць характар. На жаль, гэта найбольш слабая частка фільма. Як святы на іконах, як сонечны прамень, сусальны герой з выглядам «ахвяры» прымае ўсе нягоды лёсу. Я згодна з ацэнкай рэцэнзента ў «Советском экране»: «Героя фільма, хлопчыка Ваню, Івана Макаравіча робіцца шкада, да таго ён добры... Хлопчык, які можа ва ўсім сабе адмаўляць, які з любві да людзей забывае пра сябе, які такі добры, што хочацца стаць перад ім на калені, хлопчык гэты наўрад ці можа стаць любімым юнага гледача».

У гэтых і іншых рэцэнзіях гаворацца і добрыя словы пра фільм. І гэта заканамерна, бо добразычлівы аналіз дапамагае аўтарам лепш зразумець, што ўдалося, а што не.

На жаль, некаторыя рэцэнзенты, страціўшы пачуццё меры, напісалі пра «Івана Макаравіча» ў тоне агульнага захаплення, захвальвання. Аж тры разы выступаў у друку на гэтую тэму С. Палякоў, не зрабіўшы ніводнай крытычнай заўвагі ў адрас твора. Ствараецца такое ўражанне, быццам ён загадзя «спрачаўся» з крытыкай. Асабліва ж паказальны ў гэтых адносінах артыкул В. Лукшы, які пісаў: «Толькі так можна зрабіць сапраўдны фільм пра вайну, які б адрозніваўся ад звычайных (?) фільмаў пра вайну»... Такая катэгарычнасць выглядае трошкі дзіўнаватай у вуснах кінарэцэнзента. Што гэта такое — «звычайны фільм»? Артыкул В. Лукшы перапоўнены фразамі накшталт: «Ад фільма да фільма сталее талент рэжысёра», «Па самыя вушы ўлюбёны ў мастацтва, Ігар прайшоў добрую школу журналіста, даследчыка жыцця...» Ніякая добрая школа не можа гарантаваць поспех у мастацтве, і гэта, мабыць, ведае В. Лукша. Але пішa ў «Чырвонай змене» пешта не тое.

Ці не значыць гэта рабіць дрэнную паслугу рэжысёру? Сапраўды, для І. Дабралюбава «Іван Макаравіч» — крок наперад у параўнанні з яго першым фільмам. Але ці крок наперад гэта для беларускай кінематаграфіі, якая мае ў сваім актыве сапраўды мастацкія каштоўнасці? Не атрымалі Дзяржаўных прэмій фільмы «Праз могілкі» і «Горад майстроў», «Я родам з дзяцінства» і «Альпійская балада»... Чаму ж тады на прэмію прэтэндуе «Іван Макаравіч»? Няўжо ён і павінен стаць узорам для астатніх нашых майстроў?

Высокая ўзнагарода — Дзяржаўная прэмія, і адзначаны ёю твор павінен быць поўным арыенцірам, па якім гледачы і самі работнікі мастацтва меркавалі б пра самыя выдатныя дасягненні ў той або іншай галіне творчасці. «Іван Макаравіч» — фільм, які мае права доўга жыць на экране, фільм, у якога ёсць і будуць свае сталыя прыхільнікі. Гэта твор, пафас якога вельмі сугучны часу, — стужка служыць патрыятычнаму выхаванню гледачоў. Калі я «галасую» супраць таго, каб ён быў адзначаны высокай прэміяй, дык гэта не азначае, быццам я перакрэсліваю стужку. Не, я разумею станоўчыя якасці фільма, асабліва аператарскую работу і некаторыя акцёрскія выступленні. Аднак пераканана, што твор мастацтва, у якім ёсць нешта сапраўды «дадатнае» і нешта не менш сапраўды «адмоўнае», не мае права прэтэндаваць на вышэйшую ў рэспубліцы адзнаку.

Мусіць, чытач не стане галасаваць за такую адзнаку зборніка вершаў або рамана, дзе аўтар ішоў па пратаптаных сцежках, і мы, гартаючы кніжку, часта задаём сабе пытанне: «А дзе я сустракаў нешта падобнае, у каго?» А глядзельная зала, нават калі яна захоплена падзеямі фільма «Іван Макаравіч», такія пытанні задае і не адзін раз...

Арыгінал ці копія?

За што вы? Я — за арыгінал.

Вольга НЯЧАЙ,
кандыдат мастацтвазнаўства.

ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ

На выстаўках ля палотнаў Міхася Савіцкага заўсёды людна. Каля іх завязваюцца спрэчкі. Бо яны змястоўныя, па-майстэрску напісаныя.

І зусім заканамерна, што тры новыя работы мастака — «Пакаранне смерцю», «Рабочыя», «Хлябы» — вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1969 года.

Гэтыя палотны працягваюць і развіваюць знойдзенае мастаком раней, і, думаючы пра іх, міжволі прыгадваеш тое, што ім папярэднічала.

...«Партызаны». Адно з першых палотнаў, у якіх М. Савіцкі пачаў распрацоўку тэмы Беларусі-партызанкі — адной з вядучых у яго творчасці. Гэтая тэма хвалюе ўсіх, бо амаль кожны з нас калі не ўдзельнік гэтай барацьбы, то чалавек, які перажыў жахі вайны, цяжкасці пасляваенных гадоў.

Надоўга застаецца ў памяці твар пажылога мужчыны з пасівелымі скронямі — партызана, які, ідучы ў атрад, развітваецца з блізкім яму чалавекам. У карціне мы бачым не толькі непасрэдна паказанае развітанне, але і тое, што будзе пасля. Мы перакана ны, што чалавеку, які ўзяўся за зброю, суджаны не лёгкі шлях. Але шлях гэты будзе пераможны — пра гэта сведчыць уся атмасфера твора.

Гэта ўвогуле характэрна для многіх твораў М. Савіцкага — паказваючы падзеі складаныя, драматычныя, трагічныя, паказваючы выпрабаванні, праз якія ідзе народ, ён раскрывае веру ў перамогу. Мне прыгадваюцца персанажы карціны «Добраахвотнікі». Устрывожаныя, засяроджаныя, строгія. Гэтых розных людзей яднае высакароднае пачуццё абавязку перад Айчынай. Мне здаецца, М. Савіцкаму ўдалося ў «Добраахвотніках» пазбегнуць штампу ў вырашэнні складанай тэмы, за якую ён браўся не першы.

Наўрад ці памылюся, калі скажу, што «Пакаранне смерцю» — палатно, у якім лагічна развіваецца знойдзенае ў «Партызанах», «Добраахвотніках», «Партызанскай мадонне» і некаторых іншых творах, прысвечаных партызанскай барацьбе на Беларусі. Годнасць савецкага чалавека, нязломнасць яго духу, усведамленне абавязку—вось што надае карціне аптымістычнае гучанне.

Углядаюся ў твары. Сівы стары, на грудзях яго шыльда з надпісам. Ні ценю страху на твары старога. Ні ценю адчаю. Такія ніколі не згінаюцца перад ворагам.

А побач — двое мужчын з дужымі сялянскімі рукамі, якія ўмеюць трымаць і сякеру, і зброю. Тут жа падлетак — позірк яго, поўны нянавісці, скіраваны туды, дзе стаяць нябачныя нам, гледачам, забойцы ў касках і мундзірах фашысцкай арміі.

Жанчына, якая чакае дзіця...

Жывыя людзі, жывыя характары — розныя, але аб'яднаныя сваёй трагедыяй, непахіснасцю, верай у тое, што не дарэмна прайшло жыццё, што вырасце жыта, пасеянае вясной, што рупныя рукі дабудуюць усё, што не дабудавалі яны, што тыя, хто застанецца пасля іх, даб'юць ворага, завершаць справу, за якую змагаліся яны, вось гэтыя простыя, звычайныя людзі...

М. Савіцкі — майстар трапна знойдзенай дэталі. Так, напрыклад, у карціне «Партызаны. Блакада» — які выразны, які імклівы рух рук двух вайскоўцаў! Заўважыўшы гэты рух, адчуваеш, што і ты жывеш у гэтай карціне, што і табе хочацца кінуцца да зброі, каб помсціць за спаленыя вёскі, за здзекі фашыстаў з мірных людзей, за забітых, замучаных дзяцей...

У «Пакаранні смерцю» таксама ёсць дэталь, якая надае карціне трагічнае гучанне, дакладней — трагічным гучаннем адцяняе яе аптымістычны сэнс. Над галовамі тых, каго чакае расправа, — на фоне неба белы трохкутнік шыбеніцы, збітай з бярозавых камлёў з рудаватым, падобным на кроў, паяском кары на зрэзе. Які шчымлівы акорд!.. Там і ахвяры фашыстаў, як гэтая толькі што спілаваная бяроза. Там і не народжаны дзіцёнак, які загіне, не пабачыўшы святла родных нябёсаў, не пачуўшы шапацення бяроз... Вельмі складаныя асацыяцыі выклікае гэтая дэталь. Пададзены ў крыху незвычайным ракурсе белы трохкутнік шыбеніцы нясцерпна рэжа вочы. Амаль фізічна адчуваеш, што вось зараз, праз хвіліну, усіх гэтых людзей, з якімі паспеў зжыцца і зразумець іх, не будзе — зараз яны загінуць.

Нягледзячы на тое, што ў М. Савіцкага ў многіх карцінах персанажы пераважна статычныя, — мы амаль не заўважаем гэтага. І не заўважаем таму, што, магчыма, якраз гэтая статычнасць дае магчымасць мастаку пайсці больш складаным шляхам у перадачы характару чалавечага. Пагадзіцеся, што рух, жэст шмат у чым памагаюць падкрэсліць стан душы.

Але калі няма экспрэсіўнага руху, калі жэст стрыманы — тады ўся ўвага на аблічча персанажа карціны. Сапраўды, знешне статычныя персанажы палотнаў М. Савіцкага ўнутрана надзвычай дынамічныя. Пачуцці герояў карцін М. Савіцкага дапаўняюць адно другое, ствараючы адмысловую ўладарную сімфонію праўды чалавечага характару, сімфонію, у якой мякка акцэнтуецца вядучая тэма.

Так і ў палатне «Рабочыя» персанажы вабяць да сябе перш за ўсё тым, што кожны з іх — ярка акрэслены характар. Калі ўважліва прыглядаешся да гэтага палатна, пераконваешся, што ўсе гэтыя індывідуальнасці аб'яднаны ў адно цэлае не толькі працай на адным заводзе. У цэнтры ўвагі мастака нешта больш значнае — яснае ўсведамленне месца людзей у грамадстве, разуменне тых задач, якія стаяць перад імі.

Ёсць яшчэ адна, вельмі істотная акалічнасць, пра якую не магу тут не сказаць: у кожнай рабоце М. Савіцкага ёсць як бы своеасаблівы «дазвол» табе, гледачу, быць сааўтарам. Вельмі далікатна і тонка мастак «вядзе» цябе па сваёй карціне — ствараецца нават уражанне, быццам усё, што ў творы заключана, шукаў і знайшоў ты сам. Суровая мужнасць яго твора, складаная гама пачуццяў яго персанажаў, складаны свет душы чалавечай, які жыве ў яго карцінах, — узбагачае цябе, памнажае набыты табой душэўны вопыт — ці ж не гэта задача сапраўднага, чалавечага мастацтва?

А. КІРВЕЛЬ,
журналіст.

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА ТВОРЫ, ВЫЛУЧАНЫЯ НА ПРЭМІІ

ДАБРАЛЮБАЎ І. М. — рэжысёр, САЎЧАНКА Б. І. — аўтар сцэнарыя, ЗАЙЦАЎ Д. Е. — аператар, ДЗЯМЕНЦЬЕЎ В. А. — мастак. Мастацкі фільм «Іван Макаравіч». Вытворчасць кінастудыі «Беларусьфільм».

С. Міхайлава. Пра вайну без вайны. «Искусство кино», № 12, 1968 г.

Л. Аханоўская. Толькі яшчэ лепей! «Советский экран», № 24. 1968 г.

А. Красінскі. А калі заглянуць пад эмацыянальны пласт? «Літаратура і мастацтва», 27 жніўня 1968 г.

С. Палякоў. Дзевяты вал у дзевятым. «Знамя юности», 2 чэрвеня. 1968 г.

С. Палякоў. Добры дзень, Іван Макаравіч! «Знамя юности», 13 чэрвеня, 1968 г.

С. Палякоў. Перад шляхам на вялікі экран. «Советская Белоруссия», 25 чэрвеня 1969 г.

Е. Бондарава. У добры шлях, Іван Макаравіч! «Вячэрні Мінск», 7 чэрвеня 1968 г.

Я. Крупеня. Спатканне са сталасцю. «Настаўніцкая газета», 25 снежня 1968 г.

Д. Аляксеенка. Дзеці і дарослыя. «Ленинградская правда», 28 снежня 1968 г.

Н. Ісачанка. Праўда і яе пададбенства. «Чырвоная змена», 1 студзеня 1968 г.

Н. Натальіна. Колькі год Івану Макаравічу? «Московский комсомолец», 21 мая 1969 г.

В. Лукша. Паклон добраму чалавеку. «Чырвоная змена», 31 мая 1969 г.

НА ВЫСТАЎЦЫ КВЕТАК. Фота Ул. КРУКА.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ЖЫВАЯ ПАЛІТРА КВЕТАК

Выстаўкі кветак у Мінску ўжо сталі традыцыяй. Першая, арганізаваная ў Палацы культуры прафсаюзаў у 1957 годзе, свабодна размясцілася ў фае будынка, а ўдзельнікаў яе лёгка было пералічыць. Сёлетняй жа выстаўцы цесна ў манежы Рэспубліканскага Дома фізкультуры, і колькасць удзельнікаў значна вырасла.

Выстаўка ўражвае адразу, як толькі ўваходзіш у залу — столькі вакол хараства. Багацце колераў — насычаных і пяшчотных, яркіх і пастэльных, багацце тонаў і паўтонаў, на якія толькі здольная матухна-прырода, цешыць вока.

Усе раздзелы багатыя: жнівень жа пара цвіцення прыгожых кветак, таму і захапляе амаль усё. І каб паказанае на выстаўцы неяк зніtаваць у цэлае, нямала давялося папрацаваць яе арганізатарам — гарадскому Таварыству аховы прыроды, у прыватнасці секцыі кветкаводаў, а таксама, зразумела, Трэсту зялёнага будаўніцтва гарсавета. І аргкамітэт на чале з начальнікам гарадскога Трэста зялёнага будаўніцтва Ф. Смірновым папрацаваў нямала.

Не дзіўна, што падоўгу затрымліваюцца каля сябе наведвальнікаў цудоўныя экспазіцыі Трэста зялёнага будаўніцтва, дзе асабліва вабяць пяшчотныя ружы, гваздзікі, далікатная грацыёзная гербера, буйныя, сакавітыя астры, а таксама Батанічнага саду Акадэміі навук БССР з незвычайным багаццем руж, гладыёлусаў, выведзеных навуковым супрацоўнікам Г. Мярло, цікавай камяністай горкай з кактусамі...

Як заўсёды, багатая экспазіцыя 47-й школы. Якія яны прыгожыя, амаль чорныя гладыёлусы «Элегант» і палымнеючыя «Агні рэвалюцыі», пышныя астры, сціпла-ганарлівыя манбрэцыі і іншыя кветкі. Іх так многа, што цяжка ўсе пералічыць. Глядзіш і міжволі з зайздрасцю думаеш: які ж там павінен быць цудоўны двор... Мы даведаліся, што школьныя юннаты працуюць пад кіраўніцтвам загадчыка школьных майстэрань Івана Гаўрылавіча Максімовіча. Вось гэта аматар!

Больш сціплыя экспазіцыі 85-й, 57-й, 5-й, 65-й школ, 4-й школы-інтэрната, якія на выстаўцы ўпершыню. Але і тут адчуваецца нямала выдумкі, любві да справы. Застаецца толькі пашкадаваць, што ў горадзе, дзе больш за сто школ, у выстаўцы кветак прынялі ўдзел літаральна лічаныя. Няўжо няма чаго паказаць? Не шкодзіць настаўнікам памятаць, што азеляненне прышкольнага ўчастка, двара дапамагае выхоўваць эстэтычныя густы.

Разнастайная экспазіцыя Цэнтральнай станцыі юннатаў, зробленая не без выдумкі. Амаль ва ўсіх наведвальнікаў выклікае замілаванне сціплая кампазіцыя з буслам «Я самотны». Станцыя юннатаў таксама сталы ўдзельнік выстаўкі.

Вельмі прыемна, што сёлета з'явілася нямала навічкоў. Гэта аўтазавод, камвольны камбінат, трыкатажная фабрыка «Прагрэс», завод жалезабетонных канструкцый ДБК-1, дзіцячы парк імя М. Горкага і адзіная медыцынская ўстанова — 3-я клініка.

Пра некаторых з іх скажам асобна. Калі экспазіцыі камвольнага камбіната, завода жалезабетону, трыкатажнай фабрыкі абагульняе разнастайнасць і каляровае багацце кветак, дык своеасаблівай строгасцю вызначаецца стэнд аўтазаводцаў.

Стэнд 3-й клінікі зусім адметны. У ім пераважае кактусавая раслiннасць. І высаджана яна не ў звычайных вазонах, не на клумбах, а на кавалках туфу. Зроблена экспазіцыя з густам, арыгінальна.

Бадай, больш паспяхова, чым летась, выступілі аматары-кветкаводы, аб'яднаныя ў секцыі кветкаводства гарадскога Таварыства аховы прыроды. Сярод іх і настаўнікі, і эканамісты, і інжынеры, і журналісты, і афіцэры запасу. У кожнай кветачцы адчуваецца любоў гаспадароў. Уражвае амаль кожнае каляровае дзіва, а найбольш за ўсё — селекцыя вяргіняў Г. Шчэрбіча, супрацоўніка БЕЛТА «Руская рабінка», «Мае ўспаміны».

— Удзельнікаў выстаўкі сёлета больш, — расказвае кіраўнік секцыі кветкаводаў афіцэр запасу А. Зубарэвіч. — Да таго ж і асартымент багацейшы. Якое значэнне мае выстаўка, — працягвае ён, — можна меркаваць хоць бы па тым, што тры гады назад у нашай секцыі было 19 чалавек. Пасля кожнай выстаўкі да нас прыходзяць новыя людзі. Сёлета ў секцыі ўжо 470 аматараў...

Прыцягваюць увагу і асобныя цікавыя кампазіцыі. Падабаюцца ўсім «Сямейнае жыццё» — удала скампанаваныя калючкі і ружы, «Памяці загінуўшых медыкаў», «З чаго пачынаецца Радзіма» і інш.

Шматлікія запісы ў кнізе водгукаў гавораць аб тым, якое ўражанне выстаўка пакідае на мінчан і гасцей. У кожным шчырая падзяка. А адрасоў наведвальнікаў нямала — Клайпеда, Смаленск, Масква, Чэлябінск, Бабруйск, Барысаў, Смалявічы. Можна прачытаць і такое: «Настрой у мяне быў кепскі, — піша мінчанка Ш., — але наведаўшы выстаўку, я пра многае забылася. Кветкі сапраўды супакойваюць...»

Вельмі добра зрабіла Таварыства аховы прыроды, што паклапацілася выпусціць да выстаўкі некалькі брашурак па вырошчванні кветак. Напісалі іх аматары Я. Жыгалаў, А. Зубарэвіч, О. Цытовіч, М. Руцкі.

Нельга не здзівіцца, чаму не прынялі ўдзелу ў выстаўцы такія буйныя арганізацыі, як аддзел кветкаводства Інстытута плода- і гароднінаводства, які ўзначальвае І. Собалеў, саўгас «Мінская гароднінная фабрыка», Універсітэцкі плода-дэкаратыўны гадавальнік у Шчомысліцах, якія маюць шмат чаго цікавага паказаць.

Падведзены вынікі работы выстаўкі. Журы вызначыла лепшыя экспанаты і экспазіцыі конкурсу-паказу. Першае месца па мініяцюры атрымала кампазіцыя «Любай маме» (Цэнтральная станцыя юннатаў), а па майстэрству складання кошыкаў з кветкамі — галоўны інжынер Трэста зялёнага будаўніцтва А. Філіпаў за работу на тэму «Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Выстаўка засведчыла, што майстэрства аранжыроўкі — высокае мастацтва. І практыка пераконвае, што найбольш ім валодае той, хто сам вырошчвае кветкі.

Першыя месцы сярод арганізацый занялі Трэст зялёнага будаўніцтва, Цэнтральны батанічны сад Акадэміі навук БССР і секцыя кветкаводаў-аматараў; другія — 47-я сярэдняя школа і Цэнтральная станцыя юннатаў.

Шмат хто атрымаў заахвочвальныя прэміі.

Ірына КАРМАЛІТАВА.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

ПЕРШАЯ СКРЫПКА

КІРЫЛ КАНДРАШЫН, Генадзь Раждзественскі, Натан Рахлін, Карла Цэкі, Курт Мазур, Невіл Дзілкс — дзесяткі славутых дырыжораў выступалі з сімфанічным аркестрам Беларускай філармоніі, і кожны раз дружна ўзнімалася зала, на сцэну ляцелі кветкі... І амаль заўсёды паўтараецца адзін і той жа рытуал: дырыжор паціскае руку хударляваму музыканту сярэдняга росту з першага раду скрыпак, гэты музыкант збянтэжана робіць паклон зале, і апладысменты гучаць грамчэй...

Першая скрыпка аркестра... Важак калектыву, які, нібы штурман, вядзе музыкантаў па хвалях і штылявым спакоі партытуры і дапамагае капітану-дырыжору адкрываць слухачам цудоўную краіну музыкі.

Першая скрыпка... Каб заслужыць гэты тытул, мала быць здольным інструменталістам. Трэба ўмець хутка і дакладна ўлавіць задуму дырыжора, павесці за сабой не толькі сваю групу, а і ўвесь аркестр. І ў той жа час самому выконваць складанае скрыпічнае сола, у якое кампазітар нярэдка ўкладае самыя трапяткія і шчырыя перажыванні свайго героя, самыя пераменлівыя карціны прыроды, самыя адказныя азарэнні філасофскага роздуму...

Усяго дзве рэпетыцыі былі перад канцэртам у нашага госця з Італіі дырыжора Карла Цэкі, а праграма складаная. Таму дырыжор адразу ж пасля прыезду рашыў сустрэцца з канцэртмайстрам аркестра — камендантам канцэрта.

Яны сустрэліся. Канцэртмайстар Сямён Асновіч і славуты маэстра Карла Цэкі. І на дзіва хутка зразумелі адзін аднаго як людзі, захопленыя адной справай, людзі таленавітыя.

На другі дзень Сямён Пятровіч ужо тлумачыў музыкантам найбольш складаныя месцы партый, розных інструментаў, рэзкіх, як ён выканаць, па некалькі разоў праігрываў з аркестрантамі асобныя фразы, дамагаючыся чысціні гучання... Да прыходу дырыжора ўсе былі гатовы да працы над «Фантастычнай сімфоніяй» Берліёза, якая так натхнёна і ўзнёсла прагучала потым у канцэрце. У другім аддзяленні выконвалася «Сэрэнада» Моцарта. У кожнай частцы гэтай чароўнай п'есы ёсць скрыпічная сола. Яно патрабуе ад выканаўца філіграннай тэхнікі, цёплага гуку і, галоўнае, тонкага адчування агульнага пафасу гэтай празрыстай і зіхатлівай, як сонечны прамень, музыкі. Сямён Пятровіч іграў з вялікім майстэрствам і ўздымам. Шчырае пачуццё і юнацкі лірызм змяняліся ў яго ігры бравурна радаснай весялосцю. Аркестр уважліва прыслухоўваўся да голасу свайго важака, раўняўся на яго, цягнуўся за ім... І адбывалася нешта падобнае святочнаму ўрачыстае — Мінск слухаў сапраўднага Моцарта! Сталы голас першай скрыпкі дапамог у той вечар поспеху аркестра, якім дырыжыраваў Карла Цэкі.

Гэта не толькі талент і не толькі рамяство высокага класа. Гэта яшчэ і вопыт напружаных гадоў працы. Працы, падобнай на бясконцую вучобу.

У гады станаўлення беларускага мастацтва кампазітары і выканаўцы лічылі сваім свяшчэнным абавязкам шукаць у народзе таленавітых дзяцей. Ужо тады яны думалі аб будучых музычных тэатрах і аркестрах. Ездзілі па рэспубліцы, распытвалі людзей і слухалі, слухалі хлопчыкаў і дзяўчынак з Палесся і Віцебшчыны, з Прыдняпроўя і Наднямоння...

Сеню Асновіча, хлопчыка з Бабруйска, прыкмецілі кампазітар І. Любан і дырыжор І. Гітгарц. У Мінску ён быў залічаны спачатку ў музычны тэхнікум, пасля — у групу здольных дзяцей пры Беларускай кансерваторыі. Пасля першых вучнёўскіх канцэртаў імя хлопчыка з павагай пачалі вымаўляць нават «дарослыя» студэнты. Яны не прапускалі ніводнага выступлення юнага скрыпача. Ён лёгка іграў нават п'есы і канцэрты Вяняўскага і Сарасатэ, якія не заўсёды былі пад сілу студэнтам старэйшых курсаў.

Славуты скрыпач Міхаіл Эрдэнка пасля аднаго са сваіх канцэртаў у Мінску слухаў выхаванцаў кансерваторыі. Выступаў і Сямён Асновіч, які выканаў Фантазію на тэмы оперы «Фауст» Гуно — Сарасатэ. Міхаіл Эрдэнка высока ацаніў яго ігру.

Будучы прафесіянал разумеў, што віртуозная ігра сама па сабе — гэта далёка яшчэ не ўсё, чаго вымагае ад артыста мастацтва. Прыгука пабудаваць музычную фразу, знайсці патрэбны гук, перадаць ва ўсіх нюансах паэзію і глыбіню музыкі — вось галоўнае для скрыпача. Гэтаму вучыў яго і прафесар Аляксандр Навумавіч Амітон, да гэтага імкнуўся ён сам.

Мінула некалькі гадоў з таго памятнага дня, калі юнак упершыню пачуў «жывы» сімфанічны аркестр. Ён наведвае рэпетыцыі сімфанічнага аркестра Беларускай філармоніі. Уважліва прыслухоўваецца да ігры музыкантаў, да заўваг дырыжора. Дзень, калі Сямёна Асновіча запрасілі ў аркестр філармоніі, бадай, быў адным з самых шчаслівых у яго жыцці. З таго часу калектыў стаў для яго другой кансерваторыяй. Юнак старанна рыхтуецца да кожнай рэпетыцыі, многа працуе над сваёй партыяй. І калі аднойчы не змог іграць канцэртмайстар аркестра, Ілья Аляксандравіч Мусін — мастацкі кіраўнік аркестра — прапанаваў заняць месца першай скрыпкі Сямёну Асновічу.

...Год сорак першы. Вайна. Сямён Асновіч просіцца на фронт, але яму адмаўляюць. Зноў і зноў прыходзіць ён у ваенкамат і, нарэшце — фронт. Першае баявое хрышчэнне пад Ржэвам, разведка, баі... Пазней ён стварае франтавы ансамбль песні і танца — выступае з канцэртамі ў зацішках паміж баямі.

Скончылася вайна. Трэба яшчэ вучыцца і вучыцца. І Сямён Пятровіч вучыцца і адначасова працуе ў Дзяржаўным сімфанічным аркестры БССР. Вярнуўшыся ў Мінск, музыкант-салдат заслужана заняў месца канцэртмайстра.

НАДРУКАВАНА ў «Полымі»

РОЗДУМ НАД „ПЕСНЯЙ ПРА ЗУБРА“

Рыгор БЯРОЗКІН

У ЦУДОЎНА перакладзенай Язэпам Семяжонам «Песні пра зубра» («Полымя», № 6) Міколы Гусоўскага — выхадца з Беларусі, які жыў і працаваў у пачатку XVI стагоддзя, знойдуць сабе «спажыву» людзі з самым разнастайным колам інтарэсаў.

Гісторыка тут чакаюць бясцэнныя ў сваёй неадвержнасці сведчанні аб палітычным і сацыяльным ладзе Вялікалітоўскага княства ў час, калі яно падпала пад уладу Польскай Кароны. Даследчыка грамадскай думкі эпохі позняга Адраджэння паэма «забяспечыць» найкаштоўнейшай важнасці матэрыялам аб тых формах, якія набывала рэнесансная думка на еўрапейскай перыферыі, у паўночназаходніх славян. Нарэшце, для філолага адкрываецца прынцыпова новая мера ў падыходзе да беларускай літаратуры з улікам зробленага і тымі пісьменнікамі, якія пісалі не на роднай, а на лацінскай мове («Песня пра зубра» напісана па-лацінску).

Але ёсць яшчэ адзін і, мусіць, самы галоўны аспект паэмы, які не здымае, вядома, усе астатнія, а злівае і сінтэзуе іх у самім факце існавання «Песні пра зубра» як непадзельнага, стройнага і завершанага мастацкага цэлага. Гэты аспект, з якога ўжо не выцягнеш «самастойныя» паралельныя лініі і які ўжо сам па сабе і формула і структура, — глыбока гуманістычны змест паэмы, чалавечы, духоўны сэнс яе гаворкі, голасу і хвалявання, пачутых намі праз чатыры з паловай стагоддзі ва ўсёй іх першапачатковай свежасці, значнасці і глыбіні.

...НЕ СТАРЫ яшчэ чалавек з Літоўскага княства прыязджае ў Рым у складзе дыпламатычнай місіі епіскапа Эразма Цёлка. Тут, у «вечным горадзе», ён становіцца сведкам бою быкоў на арэне. Відовішча абуджае «хатнія» ўспаміны «правінцыяла», і ён вырашае іх запісаць, «каб успаміны свае, пераліўшы ў пявучы гекзаметр, песняй зрабіць і пра нас, і пра нашы аблавы».

Дылетант, «між паэтаў часовы абраннік», ён добра ўсведамляе складанасць пастаўленай перад сабой задачы. «З бояззю нейкай, прызнацца, са страхам душэўным пёрка нязвыклае ўзяў, адчуваю: пад ношай гэтай бязважкасці ніц упаду, бесталанны...»

І пачынаецца незвычайны, моцны якраз сваёй «дылетанцкай» непадпарадкаванасцю школьным правілам, рэдкі па сіле пластычнага адлюстравання расказ **пра зубра.** І не пра тутэйшага, з рымскай арэны, а пра свайго, далёкага, з блізкай сэрцу «літоўскай» пушчы.

Вочы прымружыш — і быццам іх бачыш на стойлішчы ў пушчы:

Лес векавечны, і ён прытаіўся між елак,
Грозны, пануры, магутны рагаты асілак.
Хай ён рыкне і прарвецца ў радкі мае рэхам
Тое рыканне — набудзе гармонію песня...

Рэнесансны чалавек, Гусоўскі імкнецца, як бачым, здабыць гармонію нават з хаосу, з «рыкання», з непрыручанай дзікасці, бо і яны матэрыяльны свет — вышэйшая для паэта інстанцыя, невычэрпная крыніца яго мастацтва.

Іменна **невычэрпнасцю** і спыняе нашу ўвагу той «партрэт» і «характар» зубра, які дае нам паэт. Невычэрпнасцю ракурсаў, колераў, гукаў, аб'ёмаў.

«Бурае дзіва з абшараў Літоўскага княства. Волатным целам сваім ён настолькі вялікі, што, калі раняць смяртэльна і ранены ўкленчыць, трох паляўнічых садзіцца ў яго між рагамі»; «злямчаны клін барады памялом вытыркае з-пад сківаў, з позірка зыраць і злосць і нянавісць і ярасць; грыва калматая шчыльна да самых лапатак шыю ўкрывае, звісаючы ўніз па калені»; «масці паджарай, як мешанка бурай і чорнай, быццам з вякоў у вякі пераходзіў праз горны і гартаваўся, сабраўшы адценні стагоддзя».

Гэта — звер, фіксаваны зрокам, «вонкавы» звер, і вынаходлівасць, шчодрасць аўтара літаральна не ведаюць меж у абмалёўцы такога, **угледжанага,** зубра.

Ёсць, аднак, і зубр «унутраны», ёсць яго ныя нораў і звычкі. Зубрыная, так сказаць, «псіхалогія». І тут ён, Гусоўскі, таксама на вышыні неверагоднай.

«Лютасцю больш небяспечны, чым люты драпежнік, зубр для людзей не страшны: не чапай — не зачэпіць, будзе стаяць, як укопаны — пастыр на варце, не страпянецца, а позіркам пасціць няспынна і чараду, і сям'ю ў чарадзе на папасе...» (Не ведаю, як у арыгінале, — перакладчыку ж удалося неназойліва, праз гэтыя «п» і «с» перадаць, як грозна і насцярожана сапе асілак).

І далей — бліскучыя радкі пра абуджэнне зубра ў зубраня, пра тое, як ён робіцца самім сабой:

Кемлівы звер па прыродзе. Напрыклад, цяляты
З першага ж дня пераймаюць паводзіны матак:
Назіркам дыбаюць за чарадой і на пашы
Нешта ўжо мыскай вышукваюць.
А пасталеўшы,
Порстка выбрыкваць пачнуць, апрабоўваць рожкі...
Так на выгодзе лясной у няспынным змаганні
За кудзярок лугавога кіпрэю, з бычка-зубраняці
Зубр вырастае, магутны прысадзісты волат...
Ходзіць спакойна і раптам у бегу імклівым
Ён, як рысак, пралятае праз галу лясную.
Проста не верыш вачам, як валодае целам
Скрытая дужасць. Нібы шыбануты прашчою,
З месца рванецца і ў момант, закінуўшы перад
Аж да хваста, перахопіць на рогі ляпёшкі
І растрасе, каб слядоў па сабе не пакінуць.

Адчуваю, што цытаванню не будзе канца, калі свядома сябе не абмяжуеш. Але як утрымацца, каб не прывесці тое месца, дзе знявечаны супернікам зубр, «з гурту адбіўшыся», «недзе прылучыцца к іншаму статку і ў прымах зменіць свой спрыт забіяцкі на статут прымацкі»...

Не кожны ганчар столькі разоў перакруціць і перамацае на ганчарным крузе нейкі няшчасны гаршчок ці гладыш, колькі ён, Мікола Гусоўскі, грузную, «як воз парыжэлага моху», многапудовую тушу звера — на чуйнай прыладзе свайго натхнення, на тонкім пёрку.

Дзеля чаго?

Дзеля жывога і непасрэднага, без ценю «трансцэдэнтальнасці» зямнога адчування жывой прыроды, як бы ўпершыню адкрытай чалавекам Адраджэння. Дзеля таго, каб перадаць «індывідуальнае якаснае жыццё рэчаў», як у дачыненні да Леанарда да Вінчы гаворыць сучасны даследчык. Дзеля радасці вызвалення з-пад улады аскетычна-рэлігійных путаў сярэдневякоўя.

Дзіця рэнесансу, прызвычаенае даваць веры толькі тое, «што сам неаднойчы бачыў, праверыў, зрабіў — свой мазолісты вопыт», Гусоўскі перабівае апавяданне пра зубра спасылкамі на аўтарытэты, каб іх удакладніць ці аспрэчыць: «Пліній, напрыклад, пісаў пра зубра і пра тура...», «возьмем, напрыклад, трактат «Лангабардскія дзеі» Паўла Дыякана. Што ён там піша пра зубра? Вельмі нямнога...»

Дэвіз Гусоўскага: «Скрозь, да апошняга слова пець толькі праўду», бо «тым, для каго я пяю, праўда за ўсё даражэй...»

Але праўда для Гусоўскага — не толькі найбольшая адпаведнасць «фізічнаму», матэрыяльнаму стану рэчаў, яна яшчэ і паняцце грамадскае і маральнае.

І намаляваны з дзівоснай сілай «літоўскі» бык увесь час, на працягу ўсёй паэмы, магутным рогам сваім выбівае то адны, то другія дзверы ў свет маральных каштоўнасцей — сапраўдных альбо падменных, — якія і складаюць, па-сутнасці, асноўны прадмет разваг і ацэнак Міколы Гусоўскага.

НАЙПЕРШАЯ і найдаражэйшая сэрцу паэта каштоўнасць — родны край.

Трэба мець на ўвазе, як імклівa і бурна, валячы ўсе перашкоды феадальнай замкнёнасці, праяўляліся цэнтрабежныя, міжнацыянальныя тэндэнцыі Адраджэння, каб правільна зразумець агульнасусветнае значэнне той праніклівасці, таго лірызму, з якім Гусоўскі ўзводзіў у ранг высокай паэзіі невядомую свету краіну, хіба славутую толькі тым, што тут, «на выгодзе ўладанняў і росаў і ляхаў» (як пісаў той жа Пліній), пануе люты лясны асілак.

І паколькі зубр — увасабленне радзімы, яе «візітная картачка», то ён і цэнтральны «герой», следам якога можна ісці і далей, па самых розных напрамках.

Скажам, у пушчу раней за ўсё.

Пушчанскія старонкі «Песні пра зубра» — цуд натуральнага спалучэння шчырай, інтуітыўнай лірыкі, першых юнацкіх ці нават дзіцячых уражанняў з бытам, з практыкай, з працоўнай дзейнасцю тагачаснага чалавека.

Спачатку — уласна лірыка:

Край свой (цяпер ужо ўласнасць Кароны) калісьці
Я перамераў удоўжкі і ўпоперак пешшу.
Змалку ад бацькі вучыўся ў бясконцых абходах
Крокам нячутным ступаць, каб нішто не шурхнула,
І спасцігаў, як звяроў прыкмячаць па бярлогах
Нюхам, і вухам, і вокам...

Там, дзе ўспамін пра мінулае, — там і роздум аб хуткаплыннасці часу і шкадаванне аб незваротным, якія набываюць у «Песні» гучанне шчымлівай да болю і такой зразумелай кожнаму чалавеку сардэчнай споведзі:

Што да мяне, то сваё паляванне і ловы
Адпаляваў я. Адзіная ўцеха ў самоце —
Жыць успамінам. Думкай ляціш быстракрылай
Ноччу і днём на радзіму, у памяці сеці
Вабіш той час незабыўны, што некалі ў нетрах
Родных лясоў разгубіўся, і кліч — не даклічаш..

Кажу: зразумелае кожнаму... На некаторых старонках паэмы проста-такі заміраеш, здзіўлены: спыненае паэтам XVI стагоддзя **сваё** імгненне — **наша** імгненне.

«У жніво ды ў касьбу і на ніве, і ў лузе бела ад хустак, намітак, кашуль і бравэрак». Хто гэта напісаў? Колас? Купала? Танк?

«А тыя дзікія пеўні, якіх апісаў яшчэ Пліній, плодзяцца ў нас... Мы іх глушцамі завем — самавітая птаха»...

Перад намі той эфект незвычайнасці, калі на зусім звычайную рэч альбо з'яву — на хустку ці на глушца — падае далёкае святло гісторыі: бач, і яны **там** былі!..

Прывяду яшчэ адзін «лясны» ўрывак з паэмы, характэрны выключнай дакладнасцю сваіх празаічных рэалій, «эканамічнасцю» ўсёй карціны, якая, тым не менш, гучыць лірычна, бо наскрозь прасякнута асабістым пачуццём паэта — яго любоўю, гордасцю, смуткам на чужыне:

Нашы лясы — гэта наша скарбонка і свіран,
Наша камора жывіцы, і дзёгцю, і ягад,
Мёду і воску, куніцы і рознай дзічыны.
Так што купец чужаземны тугой калітою,
Не паскупіўшыся, можа раскінуцца шчодра
І на таргах, і на менах — тавараў удосталь.
Тут і сасновыя бёрны, і бруссе, і кроквы,
Дуб на шалёўкі — купляй і будуйся, бязлесны.
Толькі за нашу гатоўку — гатоўкай на бочку!..
Бортнікі нашы на стаўках — разгалістых соснах —
Ставяць вуллі, а часам і ў дрэвы пад верхам
Выдзяўбуць долатам борці і лётвы прыладзяць —
Вось і стаяк-каранёк для залётнага рою.

Такая ўважлівасць пры перадачы гаспадарскага клопату, такое веданне ўсёй «наменклатуры» лесу, будовы вулля, стаяка для пчалінага рою выдаюць у паэце чалавека **народнага**, «нізавога», ва ўсякім разе, блізкага па «мазольным вопыце» тым, хто, цяжка гаруючы на сваіх валоках і моргах, адначасова неслі яшчэ цяжэйшае ярмо многіх і розных феадальных павіннасцей.

Дзіўна, але факт: у адносінах Гусоўскага да радзімы ёсць найбольш уласцівае паэзіі XIX стагоддзя (нагадаем Лермантава з яго «странной любовью» да Расіі) адзінства глыбокай патрыятычнай адданасці краю, народу і сурова-крытычнага непрыняцця сацыяльных парадкаў жыцця на радзіме.

У «вечным горадзе» паэту здаецца, што, прыпомніўшы зубра і пушчу,

Зноў ты вярнуўся ў той край, дзе пачатак пачаткаў
Сэнсу жыцця і пачуцця святога — радзіма.

Калі Гусоўскі гаворыць пра заморскіх купцоў: «Можа, мы дома дастаткам няроўныя з імі, а на таргах прыбядняцца — не ў нашай натуры», то нават і тут, у поўнай азарту гандлёвай здзелцы, непыхлівая гордасць «літвіна», маўляў, і ў нашага галава — не булава, мазгі — не пілавінне...

І той жа Гусоўскі — вораг усякіх ілюзій наконт «сацыяльнай гармоніі», «залатога веку» і г. д.

Тым буржуазна-нацыяналістычным гісторыкам, якія распісвалі Літоўскае княства як «залаты век» беларускай дзяржаўнасці, варта было б у свой час прачытаць Гусоўскага, пачуць непасрэднае сведчанне **той** эпохі:

Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называлі той век залатым. Залатыя
Ззялі аздобы ў харомах, а ў курных халупах
Вёсак, пасадаў — якая ж была пазалота?..

Княжанне Вітаўта — мінулае для паэта. Можа, становішча «нашага краю» палепшала ў яго, Гусоўскага, час?

«Цяжкі ты, хлеб наш надзённы, у промысле цяжкім — бачыце самі, аднак жа і гора радзімы нават цяжэйшае»; «клопат аратага быў і астаўся аддаўна — сошка ды ніва. Аб чым жа яшчэ яму думаць?»

І самае моцнае, самае страснае ў гэтым сэнсе прызнанне:

Стогне і ў цемрадзі ночы зламесны народ наш
Вобмацкам долі шукае. Жахлівыя здзекі
Церпіць пакутнік пад страшным прыгнётам чужынцаў!
Мы — шчэ натоўп, грамада непісьменная, цемра.
Вы не зайздросце становішчу нашаму, людцы.
Князь і баяры — усе, каму льга заступіцца,
Глухі да нас і не горай, чым жорсткі татарын,
Тушаць малейшы агеньчык нязгоды ў народзе...

„МЫ — ШЧЭ НАТОЎП, ГРАМАДА... — пра гэта таксама адна з найпільнейшых трывог і турбот Гусоўскага. Сама яго паэма — актыўнае намаганне асобы сцвердзіць сваю самацэннасць, сваю адносную незалежнасць у свеце, дзе гэтай незалежнасці праявіцца няможна праз класава-саслоўную іерархію, рэлігійныя забабоны і фанатызм.

Мікола Гусоўскі — сын сваёй эпохі, і элементы саслоўнага мыслення ёсць і ў «Песні».

«Воля сіньёра — закон непарушны для слугаў, так што тут спроба мая, а рашэнне — чужое». І хоць аўтар стараецца «быць асцярожным, каб слова і тое, што ў слове, богу і пану майму дагадзілі», мы добра адчуваем, што дагаджае ён у сапраўднасці не «богу і пану», а свайму ўласнаму сумленню, уласнаму веданню праўды, якая «за ўсё даражэй».

І ў пытаннях веры Гусоўскі такі ж чалавек на ростані, на раздарожжы. «Верачы толькі ў Ісуса Хрыста і айца яго — бога», горача молячыся дзеве Марыі і толькі ў яе шукаючы паратунку ад усіх няшчасцяў і бед, наш паэт дазваляе сабе ў дачыненні да рэлігіі той скепсіс і недавер, якія ўжо належаць чалавеку гістарычна новай эпохі.

«Я палічыў бы за грэх незнарок перамешваць ісціну з выдумкай байкі» — гэта яшчэ самае бяскрыўднае ў рэлігійным крытыцызме Гусоўскага. Далей пойдуць прамовы, куды больш грозныя, — пра варожае воінства, што «з іменем бога ідзе і ад імені бога лад свой агнём і мячом усталёўвае ў землях іншага веравызнання і іншых парадкаў».

Ёсць у Максіма Багдановіча верш «Агата», які пачынаецца так: «Помню — йшла я да ратушы хутка паглядзець, як гараць ведзьмакі...».

Сучаснік і сведка тых страшных аўтадафэ, Гусоўскі данёс да нас трагедыю саміх падзей, дыханне і голас прататыпаў «Агаты».

Дзяўчына ў Багдановіча расказвала пра **гэта** як пра нешта абыдзённа-звычайнае. Гусоўскі малюе больш экспрэсіўную і разнастайную рэакцыю «гледачоў»: «...хмара народу галёкае, свісча, плача і стогне і кленішчы шле ў паднябессе». Сам жа паэт, стараючыся захаваць выгляд «добрага хрысціяніна», непрымірымага да «ведзьмакоў-грахаводнікаў», з агідай і страхам адхінаецца ад жахлівай карціны, і па тым, **як** ён расказвае аб расправе, бачыш яго сцятыя ў роспачы вусны, белы твар, поўныя болю вочы:

Хопіць таго, каб прайшлі, пракаціліся дзейкі:
Там той вядзьмачыць ці знаецца з д'ябальскай сілай —
Зараз жа людзі ў сутанах няшчаснага схопяць
І, пераві́ўшы пастронкамі рукі і ногі,
Цягнуць к рацэ — і бултых падазронага ў прорву,
Бачаць, што кануў на дно, нібы камень, — палічаць нявінным,
Не патанулага ж будуць лічыць вінаватым.

Гэта яшчэ «закон», «працэдура» — помесь жорсткасці, маны, крывадушнасці. А вось і ўражанні самога паэта:

Сведкам такіх пакаранняў я быў неаднойчы.
Бедны тапельнік, спавіты крыж-накрыж імкнецца
Стаць на тарэц, каб пайсці пад ваду з галавою...
Бачачы гэта ўтрапенне, ты чуеш, як сэрца
З жаху мярцвее: вада на сябе не падобна.
Дзе яе прагнасць? Ну вось жа грывастая хваля
Голаў лізнула, прайшлася з разбегу па твары —
І не ўвабрала, зракласяя, як беднага — шчасце.
Больш справядлівы агонь ненажэрны...

Якія рэзка-бязлітасныя радкі! І зусім пазбаўленыя натуралізму — ледзь не заўсёднага спадарожніка страшнага ў мастацтве... Вада, якая не хоча паглынуць «злачынцу» і не ведае пры гэтым, што яе літаслівасць і дабрата кінуць яго, «вінаватага», на пакуты яшчэ страшнейшыя, у агонь, — колькі тут трагічнай разгубленасці, узрушэння, скрухі!..

Мікола Гусоўскі сцвярджаў сваёй «Песняй пра зубра» незалежнае ад варварскіх звычаяў, ад фанатызму і забабонаў рознабакова-свабоднае, згодна наказам розуму і натуры, развіццё чалавечай асобы. І ў гэтым сэнсе ён такі ж носьбіт ідэй Рэнесанса, як Леанарда да Вінчы альбо Шэкспір.

І, як яны, сцвярджаючы духоўнае жыццё асобы, прагнучы свабоды і незалежнасці для чалавечага розуму, Гусоўскі выносіць свой бескампрамісны прысуд цынічнаму, хціваму амаральнаму індывідуалізму.

У сваіх бессмяротных трагедыях Шэкспір даў цэлую галерэю гэтых «моцных», неперабарлівых у сродках крывавых авантурыстаў і ўзурпатараў: Рычард III, Яга, Эдмунд.

Гэты чалавечы тып меў вельмі шырокі попыт у тую пераходна-крызісную эпоху, і эпоха шчодра яго пладзіла. Чаго варты, напрыклад, такія «рыцары» подкупу і забойстваў, як Цэзар Борджа, альбо такія ідэолагі грубай сілы і вераломства, як Макіявелі. А яны ж былі сучаснікамі Гусакоўскага, і шматлікія іх паслядоўнікі сустракаліся яму на кожным кроку і ў княстве Літоўскім!

«Моцныя гэтага свету за права на ўладу б'юцца на злом галавы, хоць такое іх права ў сэнсе маральным і спрэчнае»; «гонар, сумленне зямных уладарцаў, здаецца, спяць беспрабудна. Усе іх учынкі і справы людзям на гора, дзяржаве ж — на шкоду і страты. Болей за ўсё непакоіць іх скарб панавання...»; «вось да чаго давяла непамысная прагнасць славы, багацця і ўлады, і як ачарсцвілі ўсё іх нутро сябелюбства, раскоша і слава...»

У святле гэтай — антыіндывідуалістычнай — філасофіі Гусоўскага вельмі цікавай і неадназначнай уяўляецца нам тая ацэнка, якую ён дае літоўскаму князю Вітаўту, з імем якога звязаны ўздым княства ў канцы XIV — пачатку XV стагоддзяў.

Вітаўт — прыхільнік «справядлівых парадкаў» у дзяржаве, але змагаецца ён супраць прагнасці, клятвадаступніцтва, «круцікаў-муцікаў ў сведчаннях» **тыранічнымі**, як кажа Гусоўскі, сродкамі і, вядома, не распасціраe сваё «дабро» на «курныя халупы вёсак, пасадаў».

Паэт аддае належнае воінскай мужнасці князя: «Сам гартаваны, як меч, на кувалдзе паходнай, Вітаўт і знаць не хацеў сабе большага шчасця, чым гартаваныя ў бітвах бясстрашныя раці». І пра таго ж Вітаўта сказана: «Ён, двуадзіны ў асобе вялікага князя — факельшчык войнаў са слабым, а з дужым анёл-міратворца».

І галоўная, бадай, «прэтэнзія» **гуманіста** Гусоўскага да «вячыстага» князя: ён пераўтварыў сілу аголенага мяча ў культ, баявую адвагу — у вышэйшую чалавечую дабрачыннасць, а ўсю краіну — у суцэльны ваенны лагер.

ТЭМА ВАЙНЫ, нашэсця і адпору захопнікам, тэма выкліканых вайной народных пакут — цэнтральная ў «Песні пра зубра».

І без таго гарачыя фарбы на палітры Гусоўскага пачынаюць проста паліць, калі ён, сабраўшы ў адно ўсю кроў і ўсе слёзы свайго народа, яго самаахвярную стойкасць і гераізм, разгортвае перад намі карціну ваеннага паядынку «на пярэднім краі хрысціянства»:

Орды варожыя грудзі на грудзі прымаем.
Кроўю сплываючы, мы абязлюдзелі ў бітвах,
Курыцы клюнуць няма дзе на целе ад ран незагойных.
Рэкамі кроў наша льецца, і гэтыя рэкі,
Хлынуўшы ўпоперак ордам татара-турэцкім,
Бег іх імклівы сцішаюць з усходу на захад.
Нашы шчыты і кальчугі ў праломах і дзірах —
Вынік няспынных удараў захопнікаў лютых.
Колькі ні жалься, ні войкай, а чэмеру гора
Не падсалодзіш жальбою. Як лес безгалосы,
Мы пад сякерай...

І тут жа — на дзіва праніклівыя радкі палітыка, дзяржаўнага чалавека, што бачыць і разумее **ўсё** ў той «міжнароднай» (як мы б сёння сказалі) сітуацыі, у якой знаходзілася яго радзіма-застава, радзіма-«варта памежная»:

Нашых суседзяў напасць батагом не кранула.
Певень чырвоны пакуль што па дахах спічастых
Крыллем не лопаў, і ўтульна пад цёплай пярынай
Кволіцца хіжы германец: яму і нігадкі,
Жар на выгарышчах нашых ён бачыць, тэўтонец,
Грудкамі золата ўласнага.

Гусоўскі — сын свайго народа, патрыёт сваёй краіны, і вайна, якую вядуць яго народ і краіна супроць азвярэлых мангольскіх орд, знаходзіць у яго душы актыўнае спачуванне і падтрымку. Ён умее гэту вайну адрозніць ад крывавых міжусобных звадаў, якія таксама спусташаюць радзіму.

І адначасова ён — прынцыповы, перакананы і паслядоўны праціўнік вайны ўвогул, вайны, пры дапамозе якой князі і каралі спрабуюць вырашыць усе супярэчнасці і канфлікты часу.

Можна зусім упэўнена сказаць, што ў сусветнай паэзіі было нямнога старонак, якія б па страснасці адмаўлення вайны, разбою, гвалту маглі б параўнацца з радкамі Гусоўскага: «Спынім забойствы! Сумленне і розум, і гонар ўладна загадваюць кніжніку: як са званіцы, бі ў сваё звонкае слова, узбройвай народы супраць разбою! Бясконца купае і губіць Марс зброяносны людзей у крывавых купальнях».

І ў кульмінацыі твора — у поўным ціхай пакоры і палымянага гневу маленні да «маці заступніцы», дзевы Марыі:

О міласэрная ўцешніца, дзева Марыя,
Не пакідай нас, прымі гэту скаргу-малітву.
Кінь свой спагадлівы позірк на нашы палеткі —
Гоні і ляды, што скрозь здратаваны і збіты
Коньмі татарскімі, коламі іхніх абозаў...
Нашым князям, што ў сваіх міжусобіцах розум
Нашай крывёй замуцілі, падай на пахмелле
Мысляў і ўчынкаў цвярозасць, вярні раўнавагу
Мудрых дзяржаўцаў, напомні пра іх абавязкі!
Гэтак злачынна забытыя, — карай напомні!

Праблема вайны хвалявала Гусоўскага не толькі з агульнагуманістычнага альбо дзяржаўнага пункту погляду: яна мела для яго яшчэ і маральны — і таксама тыпова рэнесансны — аспект.

Падобна ўсім буйнейшым мысліцелям і мастакам Адраджэння Гусоўскі задумваўся над тым, якімі шляхамі будзе ажыццёўлена пераўтварэнне «натоўпу, грамады непісьменнай», якая яшчэ ні ў побыце, ні ў псіхалогіі не зраклася феадальнай анархіі, у грамадства ра-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

АПТЫМІЗМ БЫЎ У ЯГО НАТУРЫ...

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Ц. ДАЎГАПОЛЬСКАГА

Невычэрпная энергія і аптымізм ніколі не пакідалі Цодзіка Даўгапольскага, нават тады, калі яму было за восемдзесят.

Месцам яго пасляваеннай прапіскі лічыўся Віцебск. Але толькі лічыўся, бо ўвесь час Даўгапольскі жыў у дарозе: у Маскве, Ленінградзе, Мінску, у бясконцых камандзіроўках па рэспубліцы і краіне.

Мне не аднойчы прыходзілася бываць з Цодзікам Львовічам у розных кампаніях, а часцей у паездках. Жывейшага, весялейшага субяседніка цяжка сабе ўявіць. Смешным гісторыям і выпадкам, расказам аб сустрэчах з цікавымі людзьмі, дасціпным жартам і анекдотам не было канца. І не пустое блазнаванне ці дзівацтва былі ў гэтым, а той жа неад'емны ад Даўгапольскага аптымізм, які заўсёды спадарожнічаў яму ў жыцці.

А жыццё ў старога пісьменніка было нялёгкае і няпростае. Калі ён пасля вайны здалёк прыехаў у разбураны Мінск, ён не знайшоў тут сваёй сям'і — жонкі, дзяцей: іх расстралялі фашысты. Доўгі час не друкаваўся. Жыў у сяброў, якіх таксама пасля выпрабаванняў і нягод засталося нямнога. І заўсёды быў верны самому сабе — няўрымслівы і нястомны. «Каб не было смутку, — сказаў ён аднойчы мне, чымсьці засмучанаму, «не ў гумору». — то і шчасце нас не ўзрадуе...».

Цодзік Даўгапольскі пісаў па-яўрэйску. Першая яго кніга выйшла ў 1914 годзе — зборнік аднаактовых п'ес «Карціны мястэчка». Падзеям рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, міснага будаўніцтва прысвечаны яго творы «Ля адчыненай брамы» (гэты раман быў перакладзены на беларускую мову), «Барацьба машын», «На савецкай зямлі», «Шоўк», «Агітпоезд», «З пяром у руцэ».

Шмат апавяданняў, фельетонаў, баек, падпісаных псеўданімам «Гарадокер», Даўгапольскі надрукаваў у газетах 20—30-х гадоў.

У апошнія гады свайго жыцця пісьменнік выдаў некалькі кніг на рускай мове: «Гэта было даўно», «На досвітку», «Пяць пялёсткаў», «На беразе Сілвы».

Галоўныя героі кніг Даўгапольскага — савецкія людзі, будаўнікі новага жыцця, такія ж аптымісты і жыццялюбы, якім быў і ён сам.

Р. РЭЛЕС.

«АРАУКАНА» — ГІМН МУЖНАСЦІ І ГЕРАІЗМУ

Больш за чатыры стагоддзі мінула з таго часу, як у складзе адной са шматлікіх экспедыцый на лацінаамерыканскі кантынент ступіў невядомы гідальга па прозвішчу дон Алонса дэ Эрсілья-і-Суньіга. У далёкую Амерыку яго прывяло жаданне ўдзельнічаць у заваяванні чужых зямель і праславіць сваё імя ратнымі подзвігамі канкістадора.

Усё ішло добра, пакуль прышэльцы з Іспаніі не наткнуліся на супраціўленне араўканаў, аднаго са шматлікіх плямёнаў, што жылі ў гарах цяперашняй Чылі. Дон Алонса Эрсілья быў удзельнікам баёў з араўканамі, і ён бачыў, што яны змагаліся з чужаземнымі заваёўнікамі не на жыццё, а на смерць. Мужна біліся супраць канкістадораў усе — мужчыны, жанчыны, старыя, дзеці. Араўканаў так і не скарылі. У 1641 годзе пагадненнем у горадзе Кільіне іспанцы былі вымушаны прызнаць раку Біо-Біо паўночнай граніцай тэрыторыі свабодных араўканаў. Так узнікла Франтэра — адзіная ў сваім родзе незалежная індзейская рэспубліка.

У 1560 годзе пасля аднаго няўдалага паходу, у якім Эрсілья ледзь не загінуў, ён вяртаецца на радзіму. Але ўбачанае ў Амерыцы так яго здзівіла, што гідальга дон Алонса дэ Эрсілья-і-Суньіга мяняе шпагу воіна на пяро паэта, каб у вершах апець мужнасць і гераізм свабодалюбівых індзейцаў. Ён піша паэму «Араукана».

Першая частка паэмы выйшла ў свет у Іспаніі ў 1569 годзе. Праз дзевяць гадоў з'явілася другая частка, а ў 1589 годзе паэт заканчвае сваю эпапею. На жаль, да гэтага часу невядома дакладная дата з'яўлення «Араўканы». Таму Чылійская акадэмія вырашыла, што ўсе культурныя арганізацыі краіны будуць адзначаць юбілей паэмы на працягу ўсяго сёлетняга году.

«Араукана» напісана ў свабоднай манеры эпічнага апавядання. Дзеянне развіваецца плаўна, нетаропка ў тых раздзелах, дзе паэт апавядае пра падрыхтоўку іспанцаў да далёкага паходу. Але па меры таго, як экспедыцыя набліжаецца да месца прызначэння, спакой канкістадораў знікае. Яны з трывогай думаюць, што іх там чакае. Трывога яшчэ больш узмацняецца, як толькі іспанцы ступаюць на зямлю араўканаў. Але бою пакуль што няма. Праціўнікі на адлегласці вывучаюць адзін аднаго. Нарэшце, дадзены сігнал да атакі — і паэт, адкінуўшы абыякавасць і знешнюю халоднасць, смела ўступае ў бой. Аднак як ні дзіўна: іспанец Эрсілья, гідальга з Мадрыда, не на баку сваіх суайчыннікаў, а на баку араўканаў.

Нягледзячы на бясспрэчны поспех паэмы, афіцыйная каралеўская Іспанія не прызнала паэта. Ужо занадта яўным было яго захапленне мужнасцю і гераізмам індзейцаў, што не пакарыліся Іспаніі. І апошнія гады свайго жыцця Эрсілья правёў у нястачы, бадзяючыся па еўрапейскіх краінах.

У 1594 годзе паэт памёр. Мінула больш за 200 гадоў, перш чым да яго прыйшла шырокая вядомасць. Але сапраўдную славу Эрсілья і «Араукана» набылі ў Чылі, у краіне, якая лічыць яго сваім нацыянальным паэтам.

400 гадоў мінула з таго часу, як выйшла паэма «Араукана». Песня аб мужнасці індзейцаў, гімн іх гераічнаму, хвалюе чытачоў і цяпер, як і чатыры стагоддзі назад.

А. МЯДЗВЕДЗЕНКА, карэспандэнт (ТАСС).

Сант'яга.

Работа, работа, работа... Дні і ночы. Без адпачынку. Моцарт, Бетховен, Брамс... Гэтыя кампазітары неяк асабліва хвалююць музыканта: яны любімыя. Вышэйшай прастаты празрыстая музыка класікаў патрабуе дасканалага выканання. Тут не схаваешся за бурным тэмпераментам, тэхнікай. Трэба іграць так, каб слухач адчуў стыль музыкі, задуму аўтара. І ўсе намаганні Сямёна Пятровіча накіраваны на гэта.

Здараецца, што кампазітарскае раскрыццё знаёмых музыкантам-выканаўцам тэм і вобразаў неяк асабліва кранае і западае нам у душу. Нешта падобнае бывае з драматычнымі артыстамі — тэкст ролі яны раптам успрымаюць, як свае асабістыя словы. І С. Асновіч часам адчувае, як музычны расказ, які вядзе ў адпаведнасці з аўтарскай задумай яго скрыпка, робіцца для яго амаль што асабістым выказваннем аб перажытым і абдуманым, скажам, у вайну. Колькі трагедыйнай мужнасці, а потым і шчырай прасветленай радасці перадае ён у скрыпічнай партыі «Вечна жывых» Г. Вагнера, твора, дзе кампазітар даў чалавечым галасам трымценне скрыпкі, а скрыпкам па-чалавечы выразныя інтанацыі гора, смутку, гневу і пераможнага гімна жыццю! Свае, вельмі асабістыя перажыванні перадае выканаўца ў тых старонках музычнай літаратуры, якія навеяны аўтарам уражаннямі векапомных гадоў вайны, — Д. Шастаковіча асабліва: тут дзейнічаюць вельмі складаныя асацыятыўныя сувязі. Наўрад ці я перабольшу, сказаўшы, што Асновіч, бывае, «гаворыць» ад сэрца, калі бярэ сола або вядзе за сабой струнную групу аркестра. Вядзе, уважліва гледзячы на дырыжорскую палачку, — гэта яна пракладзе галоўны фарватэр у гучанні праграмнага твора.

Мы, калегі Асновіча, бывае, бачым яго ў так званыя «хвіліны публічнай адзіноты», як іх называў К. Станіслаўскі, — калі для артыста, здаецца, няма залы, няма слухачоў і суседзяў па аркестры: ёсць толькі яго скрыпка і ноты, якія ён ведае напамяць. І тады нас вельмі ўзрушае дзівоснае паглыбленне мастака ў свет музычных вобразаў. То гэта пяшчотны і ўражлівы Чайкоўскі, то ўладна мужны Бетховен, то па-філасофску засяроджаны і мяцежны Шастаковіч... Мабыць, гэта сапраўды хараша, калі музыкант здольны нібы ўсёй істотай адчуць самабытнасць, прыгажосць і пафас кампазітарскай думкі і перадаваць яе ва ўсім багацці, адценні і нюансаў.

Гэта ўмее рабіць С. Асновіч. А ў арыгінальных партытурах сучасных аўтараў ён выступае творчым саюзнікам кампазітара — яму належаць першыя трактоўкі самых адказных момантаў у сімфанічных творах М. Аладава і Я. Цікоцкага, А. Багатырова і Я. Глебава, Л. Абеліёвіча і Г. Вагнера. Вобразна кажучы, ён мае той «залаты ключык», якім адчыняюцца дзверы ў знаёмы і незнаёмы музыкантам свет. І за гэта мы так паважаем у калектыве нашу першую скрыпку. Нездарма носіць С. Асновіч ганаровае званне заслужанага артыста Беларускай ССР.

...Чвэрць стагоддзя першая скрыпка сімфанічнага аркестра рэспублікі падае свой індывідуальны голас. Ён гучыць у самых складаных сольных партыях, у сімфанічных ансамблях «Шахеразады» і «Іспанскага капрычыо» Рымскага-Корсакава, у Патэтычнай Чайкоўскага, у Сёмай і Трынаццатай сімфоніях Шастаковіча, у новых творах Аладава, Цікоцкага, Глебава...

А побач растуць маладыя артысты — ім перадае майстар увесь свой вопыт, вучыць іх вялікаму мастацтву — мастацтву быць на ўзроўні прызвання.

Р. ГЛЯЙХЕНГАУЗ, артыст Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР.

Экслібрысы работы Я. Ціхановіча.

ГЕРОІ ФІЛЬМАЎ— МОЦНЫЯ ДУХАМ

НОВЫЯ РАБОТЫ ЛЕНІНГРАДСКІХ КІНАРЭЖЫСЕРАЎ

Ад «Чапаева» і «Дэпутата Балтыкі» вядзе лік сваіх поспехаў кінастудыя «Ленфільм». У яе павільёнах ніколі не гасне святло юпіцераў, не сціхае стракатанне кінакамер. Прыязджаюць і ад'язджаюць кінаэкспедыцыі. Вялікі творчы калектыў стварае ўсё новыя і новыя творы экраннага мастацтва. Пабываўшы на студыі, я задаў тром рэжысёрам адно пытанне: над чым вы цяпер працуеце? Вось што яны расказалі:

Генадзь КАЗАНСКІ:

— Раман Усевалада Кочатава «Вугал падзення» прыцягнуў нашу ўвагу перш за ўсё тым, што гэта яркі драматычны расказ пра рэвалюцыйнае мінулае нашага горада.

З усіх падзей грамадзянскай вайны самай драматычнай для Петраграда была абарона ад банд Юдзеніча. Двойчы падыходзілі белыя арміі да самых сцен горада — вясною і восенню 1919 года — і двойчы адкочваліся назад, разбіваючыся аб гераічную стойкасць чырвонаармейцаў і рабочых атрадаў.

Пра гэта і будзе наш фільм. Пра франтавы горад і яго мужных абаронцаў. Будзе так, як гэта напісана ў рамане: гістарычна дакументальна, праўдзіва і разам з тым арганізавана фантазіяй мастака ў стройную сюжэтную кампазіцыю. Такім чынам, побач з літаратурнымі героямі «суіснуюць» гістарычныя асобы, а сцэны, народжаныя пяром раманіста, суседнічаюць з кадрамі кінахронікі тых гадоў.

Зразумела, у фільме пра вайну важнае месца займаюць батальныя сцэны. Мы пакажам гарачыя бойкі пад Гатчынай, у Колпіна, у Дзецкім Сяле, рэйд конніцы атамана Булах-Булаховіча ў Пскоў.

Сапраўдныя месцы гэтых падзей стануць здымачнай пляцоўкай.

Толькі адно адступленне ад рамана мы сабе дазваляем. У творы Кочатава няма сцэн, непасрэдна звязаных з У. І. Леніным. Разам з тым Ільіч надаваў выключнае значэнне абароне Петраграда, сам кіраваў дзеяннямі петраградскіх камуністаў.

У фільме ў ліку дзеючых асоб — У. І. Ленін. Гэта робіць асабліва адказнай нашу работу, тым больш таму, што закончыць яе мы хочам да 100-гадовага юбілею правадыра.

Наш фільм — з дзвюх частак. Ён будзе шырокаэкранны, чорна-белы. Нам хочацца надаць кінаапавяданню характар дакумента.

Іосіф ХЕЙФІЦ:

— Пра Марыю Аляксандраўну Фортус мы даведаліся з газет некалькі гадоў назад. Журналісты расказалі яе гераічную біяграфію, поўную драматычных і яркіх падзей. Вось тады і прыйшла нам разам з пісьменнікам Рыгорам Бакланавым думка стварыць сцэнарый, у аснову якога будзе пакладзена жыццё гэтай цудоўнай жанчыны. Не дакументальны фільм пра яе, а фільм пра эпоху, што пачалася рэвалюцыяй і нарадзіла такія цудоўныя характары.

У грамадзянскую вайну ў Херсоне Марыя па заданні бальшавікоў вяла агітацыйную работу сярод маракоў арміі інтэрвентаў. Тады і пазнаёмілася яна з іспанцам Пабла, які прыехаў у Расію ў войсках Антанты, а ад'язджаў верным прыхільнікам Савецкай улады.

Выконваючы заданне рэвалюцыйнага цэнтра па барацьбе з белымі бандамі, Марыя трапіла ў рукі ворагаў і была расстраляна. Адбыўся цуд. Раненне аказалася несмяротным, і Марыю выратавалі сябры. Мы сустракаемся зноў з нашай гераіняй у час вайны ў Іспаніі. Там яна разам з Пабла, разам са сваім сынам — савецкім лётчыкам. Там адчула яна зноў радасць барацьбы і перамог і горыч цяжкіх выпрабаванняў. На фронце гінуць яе сын і муж.

Гэтыя эпізоды мінулага праходзяць перад вачыма Марыі, калі ў гады Айчыннай вайны яна расказвае пра іх сваім вучням — парашутыстам-разведчыкам перад іх адпраўкай на чарговае заданне.

І калі яны загінулі, не паспеўшы выканаць заданне, Марыя сама бярэцца зрабіць тое, што яны не змаглі.

У фінале карціны мы хочам пазнаёміць гледачоў з Марыяй Аляксандраўнай Фортус. Яна жыве цяпер у Маскве — жанчына, чыя біяграфія такая сугучная нашаму гераічнаму часу.

Мы канцэнтруем увагу на характары чалавека, які здолеў так непарыўна зліць у сваім жыцці грамадскае і асабістае, гераічнае і будзённае. Нас цікавяць акалічнасці, якія нараджаюць выключныя ўчынкі ў самых звычайных людзей. Гатоўнасць да подзвігу складае важны бок характару савецкага чалавека.

Рэзо ЭСАДЗЕ:

— Мая карціна — пра спорт, пра футбол. І разам з тым не толькі пра спорт. Таму я не буду закранаць сюжэт фільма, а раскажу перш за ўсё пра яго праблематыку.

Адна з важнейшых праблем — праблема рубяжа, якога можа дасягнуць чалавек. Дзе мяжа магчымага? Які шлях працы і барацьбы трэба пераадолець, каб стаць першым, адным з першых?

Герой нашага фільма — футбаліст Лаўроў — кумір публікі. Для тых, хто сядзіць на трыбунах, футбол — гэта грацыя, відовішча, спектакль. А для Лаўрова — праца, пот і стома.

Мы знаёмімся з Лаўровым у дзень апошняга матча, апошняга ў яго жыцці. Яму ўжо трыццаць пяць. Пара канчаць. Куміру не даруюць памылак. Хіба гэта толькі спартыўная, а не агульначалавечая праблема — пакінуць любімую справу, калі не можаш яе выконваць так, як раней? Калі даводзіцца прызнаць перавагу тых, хто ідзе следам? На гэта патрэбна мужнасць.

— І яшчэ адна тэма — фантастычная адданасць сваёй любімай справе. Лаўроў здольны ахвяраваць усім у імя футбола. Ён чалавек моцны духам.

Зразумела, не толькі ў спорце ўзнікаюць такія праблемы.

Мы стараемся стварыць фільм-дакумент, у якім не будзе ніякай тэатральнасці, ніякага акцёрствавання.

Дыялектыка жыцця, натуральны рух свету ў гэтай змене. Вось пра што я хачу здымаць фільм. Футбол — толькі матэрыял для роздуму, для раскрыцця псіхалогіі чалавечых адносін.

Вось чаму і матчы, якія мы будзем здымаць, важныя нам не знешняй эфектнасцю, а псіхалагічнымі сутыкненнямі, драматызмам канфліктаў людзей. Таму нам давялося стварыць для фільма сваю каманду, у якую ўвайшлі выдатныя ігракі, фанатыкі футбола, якія цяпер ужо не ўдзельнічаюць у спаборніцтвах, такія, як Кесараў, Бубукін, Цароў, Сальнікаў. Яны памогуць нам не толькі ў эпізодах гульняў, але і ва ўсёй рабоце над фільмам.

Яўген СЯМЁНАЎ.
(АДН).



Мінскае мора.

Фотаэцюд Ул. КРУКА.

ДРУЖБА НАРОДАЎ— ДРУЖБА ЛІТАРАТУР

Падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Саюзам пісьменнікаў СССР і Саюзам славацкіх пісьменнікаў

Некалькі дзён у Маскве, па запрашэнні Саюза пісьменнікаў СССР, была дэлегацыя Саюза славацкіх пісьменнікаў у складзе Войцеха Мігаліка (кіраўнік дэлегацыі), Павала Горава, Андрэя Плаўкі і Уладзіміра Жабкая. Літаратары са Славакіі разам з савецкімі калегамі абмяркоўвалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Саюзам пісьменнікаў СССР і Саюзам славацкіх пісьменнікаў на 1969 год. 30 ліпеня адбылося падпісанне пагаднення. Яго падпісалі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. Маркаў і старшыня Саюза славацкіх пісьменнікаў Войцех Мігалік.

Пагадненне прадугледжвае канкрэтныя мерапрыемствы па пашырэнні сяброўскіх творчых сувязей.

Сёлета Чэхаславакія ўрачыста адзначае 25-годдзе Славацкага нацыянальнага паўстання. На юбілейныя ўрачыстасці ў Браціславу выедзе група савецкіх пісьменнікаў, а дэлегацыя славацкіх пісьменнікаў прыме ўдзел у святкаванні гэтай даты ў СССР.

У лістападзе да нас у краіну прыедуць славацкія літаратары для ўдзелу ў святкаванні 52-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Саюзы пісьменнікаў СССР і Славакіі будуць праводзіць рэгулярныя паездкі пісьменнікаў для ўдзелу ў вялікіх літаратурных падзеях. Восенню на Украіне пройдуць Дні чэхаславацкай культуры, на якія ў госці да ўкраінскіх літаратараў прыедуць і іх калегі са Славакіі.

Традыцыі ўзаемных творчых кантактаў украінскіх і славацкіх пісьменнікаў маюць даўнія і глыбокія сувязі, гэта знайшло сваё адлюстраванне ў падпісаным пагадненні. Славацкія пісьменнікі ў верасні гэтага года прыедуць на юбілейныя ўрачыстасці з выпадку 200-годдзя з дня нараджэння выдатнага ўкраінскага паэта і драматурга Івана Катлярэўскага. Апрача асабістых кантактаў, пісьменнікі Украіны і Славакіі будуць рэгулярна абменьвацца супрацоўнікамі паміж часопісамі «Всесвіт» і «Рэвю замежнай літаратуры» і праводзіць іншыя мерапрыемствы.

Група славацкіх пісьменнікаў прыме ўдзел у святкаванні 100-годдзя з дня нараджэння армянскага паэта Аванеса Туманяна.

У лістападзе ў гасцях у славацкіх пісьменнікаў на Днях эстонскай культуры ў ЧССР пабываюць эстонскія літаратары.

Пагадненне прадугледжвае таксама шырокі абмен кніжнымі навінкамі, творчыя кантакты паміж часопісамі «Знамя» і «Словенске погляды», паездку групы савецкіх перакладчыкаў славацкай літаратуры для павышэння кваліфікацыі і азнаямлення з літаратурным жыццём Славакіі.

Падпісваючы пагадненне, Г. Маркаў сказаў:

— Нас звязваюць непарушныя вузы дружбы і братэрства, асвячоныя разам пралітай крывёю ў барацьбе супраць самага злоснага ворага чалавецтва — фашызму. Я ўпэўнены, што пагадненне адкрывае шырокія магчымасці для паляпшэння і ўмацавання нашых кантактаў. Мы запэўніваем вас у тым, што прыкладзем усе намаганні для выканання падпісанага пагаднення ў інтарэсах дружбы нашых літаратур, нашых народаў...

У слове ў адказ Войцех Мігалік сказаў:

— Мы вельмі рады падпісанню пагаднення паміж Саюзам пісьменнікаў СССР і Саюзам славацкіх пісьменнікаў. Мы глыбока перакананы ў тым, што гэта крок да далейшага ўмацавання нашых творчых кантактаў, заснаваных на традыцыйных адносінах дружбы нашых народаў і нашых літаратур. Мы ўпэўнены, што гэта падзея будзе садзейнічаць развіццю сяброўскіх сувязей паміж пісьменнікамі і народамі Славакіі і Савецкага Саюза. Мне хочацца пажадаць, каб і далей мы сустракаліся як самыя лепшыя сябры і таварышы.

Войцех Мігалік ад імя Саюза славацкіх пісьменнікаў паднёс у дарунак Саюзу пісьменінкаў СССР кнігі на славацкай мове.

Наш карэспандэнт папрасіў кіраўніка дэлегацыі славацкіх пісьменнікаў сказаць некалькі слоў з выпадку падпісання пагаднення чытачам «ЛГ»:

— Для нас дагавор вельмі важны ў тым сэнсе, што гэтым актам мы ўзнаўляем традыцыйныя сяброўскія адносіны паміж нашымі літаратурамі. Гэта натуральна і лагічна. Асаблівае яго значэнне для літаратараў Славакіі, на мой погляд, яшчэ і ў тым, што тут, у Маскве, упершыню выступаюць прадстаўнікі нашага Саюза славацкіх пісьменнікаў.

Не менш важны і той факт, што падпісанне адбылося напярэдадні знамянальнай даты — 25-й гадавіны Славацкага нацыянальнага паўстання.

Пры падпісанні пагаднення прысутнічалі саветнік пасольства ЧССР у Маскве Іржы Таўфер, сакратары праўлення Саюза пісьменнікаў СССР С. Баруздзін, К. Варанкоў, М. Ібрагімаў, С. Сартакоў.

На другі дзень дэлегацыя Саюза славацкіх пісьменнікаў мела гутарку ў Аддзеле культуры ЦК КПСС.

(«Литературная газета», № 32 ад 6 жніўня 1969 г.).

ВЯРТАННЕ ШЭДЭЎРА

У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны экспанавалася масіўная бронзавая статуя — твор вядомага італьянскага мастака і скульптара Антоніа Кановы. Яна была вядомая пад рознымі назвамі: «Багіня міру», «Веснік міру», «Багіня Ніке». Паводле вопісаў і навуковых пашпартоў мастацкіх твораў гэты экспанат у большасці дакументаў значыўся пад назваю «Багіня міру».

У час эвакуацыі музея ў 1941 годзе ў горад Урупіна Валгаградскай вобласці, «багіня» прапала і да апошняга часу аб ёй нічога не было вядома.

Дзякуючы клопатам адміністрацыі Гомельскага музея ўдалося знайсці унікальны экспанат. Усе гэтыя гады ён быў у фондах Варонежскага абласнога музея выяўленчых мастацтваў. Аб гэтым гомельскія мастацтвазнаўцы даведаліся з нарыса, што быў змешчаны ў варонежскай абласной газеце. І вось у пачатку жніўня «Багіня міру» вярнулася на сваё месца ў горад над Сожам. Цяпер скульптура вагою каля 2,5 тоны ўстаноўлена ў вестыбюлі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

«Багіня міру» — літая бронзавая статуя жанчыны з крыламі, у галаўным уборы. Яна топча змяю. Раней у яе руках былі аліўкавая галінка і жэзл (кап'ё). Статуя ўваходзіла ў мастацкі мемарыяльны комплекс Петрапаўлаўскага сабора графа Румянцава ў Гомелі.

М. ГАТОЎКІН.
галоўны ахоўнік Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

На здымку «Багіня міру».

ПОМНІКІ СТАРАЖЫТНАСЦІ БУДУЦЬ ВЫРАТАВАНЫ

ААР уключылася ў сусветную кампанію па выратаванні старажытна - егіпецкіх храмаў Філе. Небяспека страціць іх для чалавецтва ўзнікла ў сувязі з узвядзеннем сучасных гідратэхнічных збудаванняў на Ніле. Гістарычныя помнікі Старажытнага Егіпта — гэта гонар скарбніцы сусветнай цывілізацыі. У той жа час яны складаюць нацыянальнае багацце Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі.

Пагроза існаванню гістарычных помнікаў Філе ўзнікла яшчэ ў 1902 годзе пасля збудавання першай «малой» Асуанскай плаціны. Воды водасховішча залівалі ніжнія часткі храмаў і змывалі фарбы з ніжніх барэльефаў, якія да гэтага цудоўна захоўваліся на працягу больш за два тысячагоддзі. Аднак рэальная пагроза ўзнікла пасля збудавання высотнай Асуанскай плаціны і стварэння гіганцкага водасховішча «Наср». Вучоныя падлічылі, што калі не будзе прынята тэрміновых захадаў, дык да 1971 года храмы Філе знікнуць пад вадой.

Егіпецкая «Арганізацыя па выратаванні помнікаў Нубіі» разам з замежнымі вучонымі распрацавала план выратавання храмаў. Як заявіў на прэс-канферэнцыі з выпадку пачатку Сусветнай кампаніі па выратаванні храмаў Філе міністр культуры ААР Сарват Окаша, перад тым, як пачаць дэмантаж і перанос храмаў, вырашана абнесці іх высокім часовым насыпам, які перагародзіць доступ вады да іх, асушыць тэрыторыю вострава і потым дакладна зарэгістраваць размяшчэнне розных дэталей і архітэктурныя асаблівасці храмаў. Усё гэта неабходна для таго, каб не дапусціць памылкі, калі з распілаваных на часткі храмаў на размешчаным непадалёку ад Філе востраве Англікі будзе праводзіцца іх мантаж.

Да ліку помнікаў, пра якія ідзе гаворка, адносяцца храмы, пабудаваныя ў IV—III стагоддзях да нашай эры апошнімі егіпецкімі фараонамі.

Трэба сказаць, што сама ідэя праекта, па якім будуць весціся работы, не новая. І раней, гэта значыць у пачатку нашага стагоддзя, былі праекты прадухілення гібелі храмаў. У іх ліку быў і праект, які цяпер прынята за аснову. Аднак тады гэты план здаваўся «фантастычным». Між тым егіпецкія спецыялісты маюць цяпер не толькі ўсю неабходную для яго ажыццяўлення тэхніку. У іх накоплен значны вопыт, атрыманы ў ходзе работ па выратаванні ад затаплення водамі возера «Наср» велічнага храма Абу Сімбел, які быў распілаваны на вялікія блокі і зноў пастаўлены ў верасні мінулага года на новым месцы.

Паводле плана, распрацаванага «Арганізацыяй па выратаванні помнікаў Нубіі», прадугледжваецца, што для ажыццяўлення ўсіх работ, звязаных з перамяшчэннем храмаў, спатрэбіцца 58 месяцаў. Яны будуць працягвацца да 1974 года. Аднак ужо зараз ёсць пэўныя зрухі. Як заявіў міністр культуры ААР Сарват Окаша, з мая гэтага года, калі былі распачаты работы, 17 храмаў дэманціраваны, восем з іх ужо зноў пабудаваны на новым месцы і яшчэ чатыры будуць пабудаваны да канца года.

К. ДУДАРАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Каір.

СВЯТА Ў ЮБІЛЕЙНЫМ СКВЕРЫ

Дзевятага жніўня споўнілася 25 гадоў Мінскаму аўтамабільнаму заводу. За гэты час беларускія «МАЗы» набылі сусветную вядомасць. Іх можна сустрэць на дарогах 47 краін. Добра зарэкамендавалі яны сябе і на будоўлях нашай краіны.

У гонар 25-гадовага юбілею гэтымі днямі на тэрыторыі завода адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага сквера. У ім шмат дэкаратыўных дрэў, кустарнікаў і кветак.

На цэнтральным месцы, як помнік працоўнай доблесці калектыву завода, на вялікім пастаменце ўзвышаецца першы аўтасамазвал, зроблены тут больш як 20 гадоў назад. На мемарыяльнай дошцы выбіты словы: «МАЗ-205» — першы аўтамабіль, створаны калектывам нашага завода. Выпускаўся з 1947 па 1965 г.»

У мінулую нядзелю ў новым скверы адбыўся вечар адначынку маладых аўтамабілебудаўнікоў, прысвечаны юбілею завода і працоўным традыцыям ветэранаў.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

12 жніўня

Першая праграма. 10.00 — Навіны (М). 10.15 — Для дзяцей. «Умелыя рукі» (М). 10.45 — «Радасць творчасці». «Шчодрасць сэрца і рук чалавечых». Трансляцыя на Маскву. 11.15 — Канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці (М). 12.15 — Тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Таліна. 15.15 — Праграма перадач. 15.20 — Для дзяцей. «Зімовая ранніца». Мастацкі фільм. 16.45 — Навіны (М). 17.00 — «Аб'ектыў». Перадача для фотааматараў (М). 17.45 — На IX Усесаюзнай летняй Спартакіядзе прафсаюзаў СССР. Спартыўная гімнастыка (М). 18.30 — «Хто сее вецер». Тэлевізійны дакументальны фільм (М). 19.00 — «Падпольны фронт». Тэлевізійны шматсерыйны мастацкі фільм (Польшча). Восьмая і дзевятая серыі (М). 20.50 — «Час». Інфармацыйная праграма. (М). 21.30 — Месячнік савецка-в'етнамскай дружбы. «У краіне абпаленага лотаса». Выступленне журналіста В. Хорсуна. 21.55 — Канцэрт па заяўках будаўнікоў. 22.30 — «Панарама навін». 22.45 — На IX Усесаюзнай летняй Спартакіядзе прафсаюзаў СССР. Перадача з Рыгі. 23.30 — Навіны (М).

Другая праграма. 20.00 — «Дзень сонца і дажджу». Мастацкі фільм. 21.30 — Праграма каляровага тэлебачання. 1. «Угліч». Дакументальны фільм. 2. «Горад і песня». Тэлевізійны музычны фільм (М).

13 жніўня

Першая праграма. 10.00 — Навіны (М). 10.15 — Тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Краснадара. 10.45 — Для школьнікаў. «Пеця і воўк». Музычны фільм (М). 11.15 — А. П. Чэхаў. «Кветкі запозненыя». Тэлевізійны спектакль (М). 16.55 — Праграма перадач. 17.00 — Навіны (М). 17.15 — Канцэрт класічнай музыкі. Перадача з Ленінграда. 18.00 — «Пешаход, аўтамабіль, вуліца». «Увага! На вуліцы дзеці». 18.20 — «Панарама навін». 18.30 — па ленінскіх мясцінах. «Ленін у Англіі (М). 19.00 — Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Ленінскія чытанні. «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі і яе міжнароднае значэнне». 20.25 — Канцэрт артыстаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. 21.15 — Першынство СССР па футболу. «Дынама» (Мінск) — «Нефтчы» (Баку). Другі тайм (у запісе). 22.00 — «На парадку дня — жніво». Рэйд-агляд Беларускага тэлебачання. 22.25 — Экран кароткаметражнага фільма. «Паўза». 23.00 — На IX Усесаюзнай летняй Спартакіядзе прафсаюзаў СССР. Воднае пола. Трансляцыя на Маскву (у запісе). 23.30 — Навіны (М).

Другая праграма. 18.00 — «Маршрутамі пяцігодкі». Перадача з Данецка. 18.30 — Дзіцячы экран. «Дзюймовачка». Мультыплікацыйны фільм. 19.00 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 19.30 — Першынство СССР па футболу. «Дынама» (М) — «Спартак» (М). У перапынку — навіны (М). 21.15 — А. Талстой. «Актрыса». Тэлевізійны спектакль (М). 22.00 — Праграма каляровага тэлебачання. Перадача з Кіева.

14 жніўня

Першая праграма. 10.00 — Навіны (М). 10.15 — Па ленінскіх мясцінах. «Ленін у Англіі (М). 10.45 — «Захавальнікі «зялёнага акіяна». Тэленарыс (М). 11.15 — Тэлевізійны тэатр для дзяцей. Д. Радары і М. Сартарэлі. «Трава жаданняў». Лялечны спектакль. Перадача з Кішынёва. 16.55 — Праграма перадач. 17.00 — Навіны (М). 17.15 — «Трэці семестр». Перадача чацвёртая. 17.40 — «Панарама навін» (Уключэнне Гродна). 18.00 — Чэмпіянат Еўропы па грэблі на байдарках і каноэ (М). 19.15 — Праграма каляровага тэлебачання. «Сем старых і адна дзяўчына». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 20.40 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Мелодыі беларускага кіно». Канцэрт. Трансляцыя на Маскву. 21.45 — На IX Усесаюзнай летняй Спартакіядзе прафсаюзаў СССР (М). 22.45 — Навіны (М).

РОЗДУМ НАД «ПЕСНЯЙ ПРА ЗУБРА»

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

зумных і вольных чалавечых асоб, **што** будзе звязваць гэта грамадства, на якой аснове ўсталюецца гэта людская агульнасць.

Далёкі ад таго, каб даць матэрыялістычны адказ на сваё ж пытанне: «Чыёю злачыннай рукою губяцца сувязі братнія?», Гусоўскі рашуча адхіляў прэтэнзію грубай і бездухоўнай сілы стаць адзіным і непарушным грунтам, на якім бы злучаліся людзі хаця б у рамках племені, народа, краіны.

І тут зноў выходзіць на авансцэну паэмы зубр, і ўжо ў новай ролі, вельмі важнай для агульнага замысла твора: на пушчанскім плацдарме, у небяспечных і зменлівых перыпетыях «літоўскай» карыды паэт-гуманіст скрыжоўвае клінок сваёй думкі з атручанай зброяй тых, хто зброю зрабіў прызваннем, рамяством, жыццёвай філасофіяй.

Выдумка гэта карэннем сваім пранікае
У княжанне Вітаўта ў годы найвышэйшага уздыму
Княства Вялікалітоўскага: нат і тады ўжо
Сілам яго падупалым патрэбен быў подзвіг.
Вось і зрабіў тады князь у сваіх уладаннях
Лагер ваенны у кожным паселішчы ў пушчах,
Дзе рыхтаваў свае раці да бітваў наступных.

Пра тое, што адбывалася ў гэтых лагерах-табарышчах, пра іх парадкі і быт, Гусоўскі расказвае з выдатным мастацкім адчуваннем дэталі («толькі і чуеш, як стрэлы спяваюць, а лукі суха на згібах скрыпяць») і, галоўнае, з вялікай пагардай, нават з агідай да бездухоўнай элементарнасці прафесіянала-забойцы: «Трапны стралок, а такіх дзецюкоў была безліч, змеціўшы ключ жураўліны пад воблакам дзесьці, зложыцца з лука: спакойна прыцэліцца, зрэжа роўна крыло ў важака, не крануўшы стралою нават і пёрка на целе — такая дакладнасць!»

І дзіва, што для такога стралка, для **масы** такіх стралкоў, сабраных у адно месца дзеля «ўдасканалення» свайго «майстэрства», найбольш вартаснай іх «дакладнасці», тупасці і азарту мішэнню становіцца «магутны, прысадзісты волат», яго дужасць, і ярасць, і боль!

Сцэны раз'юшана-дзікага палявання, ці правільней дзікай аблавы, дзе ўсё без рэшты каверза, падман і бязмэтная жорсткасць, спыняюць сваёй трагічнай экспрэсіяй. І зубр тут зусім не той, што ў пачатку:

Крыкам напуджаны, доўгай пагоняй загнаны,
Звер абнямог канчаткова. І ярасць не тая.
І не ранейшы запал. Адчувае як быццам —
Хутка канец. Прабягаюць па скуры раз-пораз
Дрыжыкі зябкія, дыхае з хрыпам, і пара
Верне клубамі — відаць, што стамілася сэрца...

І смуткам амаль чалавечым працінаюць нашыя сэрцы «перажыванні» зубра, калі ён «схіснуўся і пысай тыцнуўся ў снег і прыкленчыў, нібы пакланіўся шумнай дуброве: «Даруй, мая родная, ўсё мне», і «недзе сябры зараўлі: пракацілася рэха...»

Ну, а тыя, што «поступам смелым да звера бліжэй падыходзяць... каб эспадай пад сэрца справа і злева на дол абваліць раганосца»? О, тым, напэўна ж, здаецца, што яны — вартае глыбокай пашаны і ўхвалы чалавечае пабрацімства, лучнасць, саюз...

Недарэчнасць, памылка, вартая жалю ілюзія! — адказвае ім Гусоўскі. І сам палясоўшчык, сын палясоўшчыка, які зведаў шчасце і горыч сумленнага палявання, ён поўным годнасці жэстам: «Хай выжывае, не буду гнацца ў пагоні за раненым...» адлучае ад сябе разбойнае кодла, якое, па-сутнасці, нішто іншае, як «безліч дзецюкоў», «натоўп, грамада непісьменная».

І яшчэ ён карае гэта безаблічнае, безыменнае «пабрацімства», чый лозунг: «Сродкі — любыя, а мэта адна — вынішчэнне», тым, што называе толькі **адно** імя, і тое ў здзеклівай эпітафіі на крыжыку з белай бярозы: «Тут упакоіўся ў бозе раб божы Лаўрэнці, страхам забіты, знянацку сустрэўшыся з зубрам». (Здзеклівасць гэта, вядома, не ад паэта — ад «баявых» сяброў нябожчыка з іх спецыфічным кодэксам гонару і геройства)...

«Хаос сусветны» — два апошнія словы «Песні пра зубра». Імкненне пераадолець гэты хаос, імкненне сцвердзіць гуманістычныя прынцыпы дабра і свабоды і вялі лёгкім — і такім важкім, такім «грузапад'ёмным»! — пяром Міколы Гусоўскага, які супрацьставіў дысгарманічнаму, разарванаму свету цэласны, «матэрыяльны» вобраз самога свету ў разрывах і супярэчнасцях і свой ідэал, якому належыць будучыня...

Сказаць, што Я. Семяжон выдатна пераклаў выдатны літаратурны помнік старажытнасці, значыць сказаць вельмі мала — Семяжон вярнуў вялікаму твору яго **ўласную** — беларускую — прыроду, арганічную плоць і кроў ягонага замысла і выканання, яго стыхію і ўлонне, яго водар, гучанне, фарбы, адценні.

Семяжон вярнуў Гусоўскага Гусоўскаму.

І глушэц перастаў ужо быць дзікім пеўнем, і замільгалі хусткі на постаці, а не розныя там лацінскія «адэкваты» хусткам, і загучэла «смачнае» мужыцкае прыслоўе, накшталт «звяроў прыкмячаць... нюхам, і вухам, і вокам», і простая народная мудрасць тыпу «будзе на свеце спакой, дык і песенька будзе», і гаркота народная: «Ім бы свайго дамагчыся, а ты хоць залiся...» і народная экспрэсія ў апісаннях, як, напрыклад, у радках пра птушку, што, «залопаўшы крыллем, чмякнецца вобземлю...»

Неверагодна, каб Гусоўскі, які па ўласным яго прызнанні «свет даўніны вывучаў... па кнігах славянскіх, граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай», думаў, марыў, пакутваў і радаваўся неяк інакш, не так, як у створанай Я. Семяжонам беларускай версіі «Песні пра зубра».

Перакладчыку аказалася пад сілу ўсё ў гэтай паэме: лірыка, пластыка, філасофія, пафас, сарказм. І найтанчэйшая оптыка назіранняў: «ачэрнены кончык хваста гарнастая», сарочы цень на сумёце.

Цэласнасць, сінтэз, плынь!

Паяўленне «Песні пра зубра» не проста падзея — свята. Свята беларускай паэзіі, беларускай культуры.

КУТОК КАЛЕКЦЫЯНЕРА

НЕЎМІРУЧЫ ПОДЗВІГ

25-годдзю вызвалення ўкраінскага горада Нікалаева ад гітлераўскіх захопнікаў прысвечана паштовая мініяцюра, зробленая па малюнку мастака Івана Мартынава. У баях за горад вялікую ролю адыграў гераічны дэсант маракоў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Альшанскага. Ён адбіў 18 лютых атак фашыстаў, якія мелі на гэтым участку большыя сілы. 68 удзельнікам дэсанту было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Манумент слаўным дэсантнікам у Нікалаеве і Зорка Героя Савецкага Саюза адлюстраваны на мініяцюры.

Марка выканана ў чырвона-фіялетавай колеравай гаме. Намінал — 4 капейкі. Друк — глыбокі. Зубцоўка — грабеньчатая. Памеры па перфарацыі — 30 на 42 міліметры. Нумар па каталогу — 3811.

Людміла КЕЛІМ.
(АДН).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 17173